

**У Курску сабраліся ветэраны з усяго СНД**

СТАР. 5



**Апошні помнік «віленскага» барока...**

СТАР. 6



**Тэа сустрэлі з песнямі і танцамі**

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 МАЯ 2014 г. АЎТОРАК № 86 (27696) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# СТРАТЭГІЧНАЯ ПАЗІЦЫЯ

### Захаду не варта выкарыстоўваць Украіну ў якасці фактару ціску на Расію

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з сакратаром Савета бяспекі Расійскай Федэрацыі Мікалаем Патрушавым, паведамляе БЕЛТА.**

«Сітуацыя вакол няпростая, мы гэтага не ўтойваем, і з Прэзідэнтам Расіі, прэм'ер-міністрам, сустракаючыся, мы яе абмяркоўвалі. Напэўна, добра, што ў нас ёсць магчымасць сёння з вамі пагаварыць, вы праведзяце кансультацыі на ўзроўні дзяржаўных сакратароў Саветаў бяспекі. Таму што трэба бачыць, што будзе заўтра, і скаардынаваць нашы пазіцыі, нашы дзеянні, калі гэта будзе неабходна, нам таксама вельмі важна», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Галоўнае, каб Украіна засталася Украінай, не стала базай Паўночнаатлантычнага альянсу ля нашых межаў. Мы гэтага не ўтойваем. Гэта важна і для Расіі, і для Беларусі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Ну і, вядома, хацелася б, каб гэты блізкі нам славянскі народ застаўся з намі».

«Але гэта выбар украінскага народа. Яны няхай уладкоўваюць сваё жыццё так, як лічаць патрэбным, але каб не стваралі праблем сваім суседзям. Гэта галоўнае», — сказаў Прэзідэнт, выказаўшы думку, што з часам ва Украіне ўсё стабілізуецца. «Не будзе Украіна на Захадзе. Яе там ніхто і не чакае. Ну, пацямненне ў мазгах у палітыкаў, гэта бывае, вы гэта выдатна ведаеце», — сказаў беларускі лідар. «І Захаду не варта выкарыстоўваць Украіну ў якасці фактару ціску на Расію, перш за ўсё. Ды і не толькі на Расію, таму што пагаршэнне сітуацыі, у тым ліку ў эканоміцы, уплывае на ўсю постсавецкую прастору», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што на сустрэчах у Маскве з удзелам прэзідэнтаў краін АДКБ абмяркоўваліся і праблемы ў Цэнтральна-Азіяцкім рэгіёне. «Трэба сказаць, што і там праблем дастаткова. Таму і гэта павінна быць у полі зроку», — сказаў Прэзідэнт.

У сваю чаргу Мікалай Патрушаў, гаворачы пра двухбаковыя адносіны, падкрэсліў, што тут ніякіх праблем няма. «Нам проста трэба дамаўляцца, узгадняць нашы планы і потым іх выконваць. Мы так і робім», — адзначыў сакратар Савета бяспекі Расіі. Паводле яго слоў, Беларусь і Расія, акрамя двухбаковага, таксама актыўна ўзаемадзейнічаюць у шматбаковых фарматах, перш за ўсё ў АДКБ і на пляцоўцы СНД.

# ПРАВААХОЎНЫЯ СТРУКТУРЫ АКТЫВІЗАВАЛІ БАРАЦЬБУ З КАРУПЦЫЯЙ

**У краіне павялічылася колькасць выяўленых злачынстваў, якія датычацца карупцыі і абарачэння наркотыкаў. Аб гэтым учора Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку далажыў Генеральны пракурор Аляксандр Канюк, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Паводле слоў Генеральнага пракурора, нягледзячы на павелічэнне колькасці цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, якія выяўляюцца, гэта ў большай ступені сведчыць не пра пагаршэнне крымінагеннай абстаноўкі ў краіне, а пра актывізацыю праваахоўнымі структурамі барацьбы з карупцыяй і незаконным абарачэннем наркотыкаў.

Акрамя таго, Прэзідэнту было далажана аб выкананні даручэнняў па аптымізацыі дзейнасці пракуратуры, у прыватнасці, па ліквідацыі ваеннай і рэарганізацыі транспартнай пракуратуры.

## Будзь у курсе!

# «ЛЕТНІ ГРАФІК» ШКОЛ

**Па інфармацыі камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, выпускныя вечары пройдуць у сталічных школах сёлета 12 чэрвеня. Пачатак урачыстасцяў — а 19 гадзіне. А 31 мая з 10.00 да 12.00 у мінскіх школах прагучаць апошнія званкі для вучняў выпускных 9-х і 11-х класаў. Экзамены будуць здаваць у чэрвені 13938 выпускнікоў базавай школы і 8168 выпускнікоў 11-х класаў.**

Уступная кампанія для тых, хто паступае ў 5-я класы гімназій, пройдзе з 2 па 10 чэрвеня, для ахвотных паступіць у 10-я гімназічныя класы — з 15 па 20 чэрвеня. А ў кадэцкіх вучылішчах адбор будзе праходзіць з 20 па 30 чэрвеня.

Таксама з 2 чэрвеня ў школах распачнецца прыём дакументаў у першыя класы. Паклапаціцца пра выбар месца навучання для свайго дзіцяці бацькі павінны да 28 жніўня. Чакаецца, што ўпершыню за школьныя парты сядуць у наступным навучальны годзе больш за 20 тысяч маленькіх мінчан.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**









Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

# СВЯТА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

— Мы ішлі да гэтай падзеі 5 гадоў, — на цырымоніі адкрыцця зазначыў **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА.** — Чэмпіянат стаў сапраўды буйным нацыянальным праектам. У яго падрыхтоўцы і рэалізацыі актыўна ўдзельнічала ўся наша краіна. Мы шчыра рады гонару прыняць у сябе гэты турнір і падарыць аматарам хакея цудоўнае свята. Зроблена ўсё, каб чэмпіянат свету ў Мінску стаў яркім, адметным і лепшым у свеце. Упэўнены, прадстаўнікі федэрацыі хакея, гульцы зборных і балельшчыкі годна ацэняць усё, што бачаць тут.

Зразумела, вывады трэба будзе рабіць толькі пасля завяршэння турніру, але сярэдняя запаўняльнасць (8940 чалавек) кажа пра вялікую цікавасць да хакея. Трыбуны, як прарочыў наш вядомы хакейны спецыяліст Міхаіл Захараў, запоўнены ледзь не на кожнай гульні. Вось і на матч Беларусь — ЗША прыйшло 13600 гледачоў. На жаль, нашы суайчыннікі амерыканцам саступілі з лікам 1:6. Але, упэўнены, гэты вынік ні ў якім разе не паўплывае на балельшчыцкі настрой беларусаў у далейшым. Прыклад гэтаму — наступны матч з Казахстанам.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

**Ці МОЖНА назваць чэмпіянат свету па хакеі святам? Яшчэ тыдзень таму я напісаў бы адмоўна, але зараз павінен перагледзець свае погляды. Так, безумоўна, ён кагосьці не закранае і, магчыма, на фоне асабістых праблем зусім не цікавіць многіх жыхароў сталіцы. Але пачуццё агульнага сяброўства, добразычлівасці замежнікаў, радасць балельшчыкаў, цягнічкі, якія яны пускаюць па віражах «Мінск-Арэны», стварае атмасферу сапраўднага спартыўнага свята. І гэта толькі пачатак!**





Фота Тараса ШЧЫРАГА.





Фота БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр СУРЫКАЎ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі:**

***«Брацкія адносіны паміж беларусамі і расіянамі падтрымліваюцца ў тым ліку і дзякуючы спорту, а асабліва хакею. Расійскія і беларускія балельшчыкі аднолькава «хварэюць» за абедзве зборныя. Гэта базавы падмурак нашага братэрства. Дарэчы, больш за ўсё квіткоў набыта менавіта расійскімі балельшчыкамі. Пакуль складана сказаць, ці ўсе з іх прыехалі. Але, хутчэй за ўсё, гэта самы масавы выезд прыхільнікаў расійскай дружыны. Хачу наведаць усе матчы з удзелам расійскай зборнай, а таксама некаторыя гульні дружыны Беларусі».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.05.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10010,00 | ▲ |
| Еўра | 13780,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 284,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 850,11 | ▼ |

## Надвор'е

# Тыдзень пад знакам дажджоў

**У аўторак тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў няўстойлівай паветранай масы, што паступае да нас з боку Заходняй Еўропы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Таму сёння ў большасці раёнаў чакаюцца кароткачасовыя дажджы, а часам магчымы навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 13-18 градусаў, па паўднёвым усходзе прыгрэе да 21 цяпла. І ў сераду на фоне паніжанага атмасфернага ціску месцамі пройдуць невялікія дажджы і навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы на сераду складзе плюс 4-9 градусаў, удзень — 16-23 цяпла, толькі па паўднёвым захадзе будзе ўсяго плюс 13-15 градусаў. У чацвер і пятніцу да нас завітае сур'ёзная паветраная маса, і зноў пойдуць дажджы, месцамі — навальніцы. У асобных раёнах узмоцніцца вецер парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра ўначы будзе пераважна плюс 7-14 градусаў, уначы на пятніцу па паўднёвым усходзе — да 16 цяпла. Удзень чакаецца плюс 16-23, на ўсходзе цяплей — месцамі 24-26 градусаў, аднак па паўднёвым захадзе толькі плюс 13-15 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**



## Святло ў акне

# ФОРМУЛА ІХ КАХАННЯ

### Амаль 60 гадоў Лідзія і Уладзімір Лісоўскія з Магілёва не перастаюць казаць адно аднаму пяшчотныя словы

**Яны нават атрымалі галоўны прыз колішняга конкурсу да Дня святога Валянціна на лепшае прызнанне ў каханні. «Убачыла ў газеце запрашэнне прыняць удзел і згадала пра вершаваны падарунак мужа, — усміхаецца Лідзія Кірылаўна, успамінаючы гэты выпадак. — Узяла паштоўку і адправіла на ўказаны адрас. Хацелася, каб ведалі, што і ў 78 гадоў людзі могуць прыгожа прызнавацца ў каханні. Мужу пра гэта нічога не сказала. А праз 2 тыдні — званок у дзверы. Прыехала здымачная група АНТ і аб'явіла, што мы — пераможцы».**

## Даўжынёй у жыццё

...Побач са мной сядзіць мужчына, які ўлюбёнымі вачыма глядзіць на сваю спадарожніцу жыцця і гатовы хоць цяпер спяваць ёй серэнады. У прамым сэнсе слова. Некалькі тыдняў таму на адным з урачыстых мерапрыемстваў Уладзімір Яфімавіч спяваў пад акампанемент магілёўскага аркестра лірычную песню, дзе ёсць пяшчотныя радкі пра адзіную на ўсім белым свеце. Калі ён у сваім парадным кіцелі капітана другога рангу стаў на адно калена перад любай, якая сядзела ў першым радзе, зала ўзарвалася апладысментамі.

Не паверыце, але Лідзія і Уладзімір Лісоўскія памятаюць нават свой першы пацалунак. Гэта адбылося праз некалькі гадоў пасля прыгожых заляцанняў. Прызнаюцца, што сімпатызавалі адно аднаму яшчэ са школы, калі ён, сямнаццацігадовы хлопец, на навагоднім бале быццам бы ўпершыню ўбачыў малодшую за яго на год прыгажуню і страціў галаву ад нечаканага пачуцця.

— Ён мяне праводзіў, але мы ішлі на адлегласці адно ад аднаго, — успамінае яна. — Каханне ў 17 гадоў — гэта як наркотык. І трэба не перайсці тую мяжу, за якой яно ператвараецца ў распусту.

СТАР. 4

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## УРАД КЫРГЫЗСТАНА ЎХВАЛІЎ ПРАЕКТ ДАРОЖНАЙ КАРТЫ ПА ДАЛУЧЭННІ ДА МС

Урад Кыргызстана ўхваліў алгарытм дзеянняў па далучэнні рэспублікі да Мытнага саюза. Паводле слоў міністра эканомікі Тэміра Сарыева, урад працягне працу над механізмам фінансавання мерапрыемстваў дарожнай карты па далучэнні Кыргызстана да МС і адаптацыі эканомікі Кыргызстана да функцыянавання ва ўмовах Мытнага саюза. Як адзначаецца, дарожная карта будзе зацвярджацца рашэннем Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц МС, таксама будзе падпісана заява аб зацвярджэнні гэтай дарожнай карты ад імя Кыргызстана і дзяржаў Мытнага саюза.

## КАЗАХСТАН З 1 ЧЭРВЕНЯ ЧАСОВА ПРЫПЫНЯЕ ІМПАРТ АЛКАГОЛЮ

Казахстан з 1 чэрвеня ўводзіць часовае абмежаванне на ўвоз і рэалізацыю на тэрыторыі рэспублікі алкагольнай прадукцыі. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні, размешчаным на афіцыйным сайце прэм'ер-міністра Казахстана Карыма Масімава. Абмежаванне на ўвоз і рэалізацыю алкагольнай прадукцыі ўводзіцца да ліквідацыі парушэнняў у частцы яе маркіроўкі, гаворыцца ў паведамленні са спасылкай на ўпраўленне па захаванні патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў і бяспекі харчовай прадукцыі Агенцтва Казахстана па абароне правоў спажыўцоў. Такая мера прынята ў сувязі з выяўленнем шматлікіх фактаў абарачэння на спажывецкім рынку Казахстана алкагольнай прадукцыі вытворчасці Італіі, Францыі, Шатландыі, Расіі, Беларусі і іншых, якая рэалізуецца з парушэннямі патрабаванняў нацыянальнага заканадаўства і патрабаванняў, устаноўленых тэхнічным рэгламентам Мытнага саюза.

## НАТА РЫХТУЕ «ПАСТАЯННУЮ ПРАПІСКУ» Ў ЕЎРОПЕ

НАТА разгледзіць пытанне аб пастаянным размяшчэнні войскаў альянсу ў краінах Усходняй Еўропы ў сувязі з абвастрэннем сітуацыі ва Украіне. Пра гэта паведаміў галоўнакамандуючы сіламі НАТА ў Еўропе амерыканскі генерал Філіп Брыдлаў. Паводле яго слоў, пытанне аб пастаяннай дыслакацыі войскаў НАТА будзе разгледжана і даведзена да абмеркавання паміж кіраўнікамі краін — членаў альянсу. Зараз групоўка войскаў НАТА прысутнічае ва Усходняй Еўропе на аснове кароткатэрміновай ратацыі.

ISSN 1990 - 763X

14086

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## НАВУКОЎЦЫ: ВАКУУМАВАНЫЯ ПРАДУКТЫ МОГУЦЬ УЯЎЛЯЦЬ НЕБЯСПЕКУ



Пад вакуумнай упакоўкай звычайных прадуктаў харчавання могуць знаходзіцца смяротна небяспечныя бактэрыі. Да такой высновы прыйшлі спецыялісты Тэхнічнага ўніверсітэта Даніі. Яны высветлілі: чвэрць пацыентаў, якія заразіліся бактэрыямі з ліку тых, што жывуць пад вакуумнай упакоўкай, знаходзяцца ў групе павышанай рызыкі смерці. Сутнасць у тым, што ва ўмовах адсутнасці кіслароду патагены — Listeria monocytogens — могуць станавіцца асабліва агрэсіўнымі. Паводле слоў навукоўцаў, з гэтага пункту гледжання небяспечныя малако, марожанае, сыр, мяса, паўфабрыкаты, рыба і агародніна. Таму прадуктаў у вакуумнай упакоўцы па магчымасці лепш пазбягаць.

## Клопат пра людзей

# «ЗАБЫТЫ КУТОК» СТАЎ БЛІЗКІМ

**Каля Лоева ўрачыста адкрылі паромную пераправу цераз Днепр. Так атрымалася, што вялікі ўчастак у так званай «зарэчнай» зоне (прыкладна пятая частка тэрыторыі раёна, дзе жывуць больш за 700 чалавек) дагэтуль быў адрэзаны ад «вялікай зямлі». У савецкі час тут існавалі пераправы, але паступова тэхніка састарэла і перастала эксплуатавацца. Людзям, каб трапіць у свой райцэнтр, размешчаны на правым беразе, даводзілася рабіць крук у 140 кіламетраў. Цяпер шлях да Лоева складае 7 км.**

Дарэчы, увасобіць інвестыцыйны праект «Будаўніцтва аўтамабільнай дарогі Абакумы — Лоеў з паромнай пераправай цераз раку Днепр» змаглі на працягу аднаго года. Сродкі ў памеры Br14 млрд вылучаны з абласнога бюджэту. Акрамя сацыяльнага значэння, паромная пераправа важная для раёна з эканамічнага пункту гледжання. З'явіцца магчымасць актыўна выкарыстоўваць сельскагаспадарчыя землі зарэчнай зоны, бо цяпер туды лягчэй дастаўляць тэхніку і грузы. Пастаянныя перавозкі паромам пачаліся з 9 мая. Штодзень будзе ажыццяўляцца па 6 рэйсаў на працягу ўсяго сезона навігацыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Да таго ж тэрыторыя на левым беразе Дняпра заўсёды была прывабным месцам для паляўнічых і рыбакоў не толькі Беларусі, але і Расіі, і Украіны. Ім таксама стане лягчэй дабірацца да прыгожых мясцін Лоеўшчыны. У размешчаным тут рэспубліканскім біялагічным заказніку «Днепра-Сожскі» налічваецца 35 відаў млекакормячых, 140 відаў птушак.

Транспартны паром быў зроблены ў Рэчыцы. Яго памер 24х17 м, грузападымальнасць — каля 60 т. Гэта азначае, што за адзін раз да сямі транспартных сродкаў, у тым ліку легкавыя і грузавыя аўтамабілі, трактары і іншая цяжкая тэхніка, будзе дастаўлена на левы бераг Дняпра паромам пры дапамозе буксіроўкі катарам.



Фота БЕЛТА.

# АГРАРНАМУ СЕКТАРУ ПАТРЭБНА НОВАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ ПАЛІТЫКА

У бліжэйшыя дні міжведамасная рабочая група па пытаннях АПК агучыць свае прапановы па развіцці аграпрамысловага комплексу

**Як адзначыў прэм'ер-міністр, кіраўнік міжведамаснай групы Міхаіл Мясніковіч, у хуткім часе будуць разглядацца падыходы па фарміраванні прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця і праграмы на наступную пяцігодку. «Таму, — сказаў ён, — мы будзем выносіць дастаткова смелыя рашэнні па развіцці народнагаспадарчага комплексу краіны».**

Па словах прэм'ера, паведамляе БЕЛТА, у першую чаргу гэтыя планы будуць тычыцца аздараўлення грашова-крэдытнай палітыкі. «У прыватнасці, захады, якія прапануе рабочая група, дазволяць знізіць стаўкі па крэдытах для сельгасарганізацый. Ёсць ускосны механізм, гэта не прамая сувязь паміж коштам крэдыту і дэпазіту. Тут дзяржава мае намер удзельнічаць як актыўны, будзем так казаць, ігрок на фінансавым рынку», — адзначыў кіраўнік урада.

У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта падрабязна падрыхтаваныя міжведамаснай рабочай групай праекты нарматыўных прававых актаў па пытаннях развіцця АПК, павышэння дысцыпліны і адказнасці кадраў будуць абмяркоўвацца на гэтым тыдні ў рэгіёнах з удзелам кіраўнікоў гаспадарак, раёнаў і аблвыканкамаў.

«Мы будзем яшчэ раз даводзіць патрабаванні ўжо па новай эканамічнай палітыцы аграрнага комплексу, пытанні адказнасці кадраў за невыкананне тэхналогій, арганізаванасці, дысцыпліны, — сказаў кіраўнік урада. — Мы на гэтым губляем каля $1,5 млрд выручкі, таму трэба, безумоўна, ашчаджаць кожную капейку».

Міжведамасная рабочая група для вырашэння праблемных пытанняў у АПК пад кіраўніцтвам прэм'ер-міністра была створана сёлета ў лютым па распараджэнні кіраўніка дзяржавы. У складзе рабочай групы 26 чалавек, у тым ліку старшыня Прэзідыума НАН Беларусі, намеснік кіраўніка спраў Прэзідэнта, старшыні Белстата, Дзяржкаммаёмасці, канцэрна «Белдзяржхарчпрам», генеральныя дырэктары аграрных навукова-практычных цэнтраў НАН Беларусі, прадстаўнікі банкаў, вядомыя кіраўнікі перадавых сельскагаспадарчых арганізацый і іншыя спецыялісты.

Задача, якая ставілася перад групай, заключалася ў выпрацоўцы канкрэтных прапаноў, у прыватнасці, па павышэнні прыбытку і рэнтабельнасці арганізацый сельскай гаспадаркі, зніжэнні запазычанасці і неплацежаздольнасці гаспадарак, змяншэнні сабекошту вытворчасці прадукцыі, развіцці племянной справы і насенняводства.

# КАРАБЕЛЬ ДА ВАРШАВЫ — ці хутка гэта стане рэальнасцю?

У Брэсце прайшла нарада па аднаўленні старажытнага воднага шляху ад Балтыйскага да Чорнага мора

**Водны шлях Дняпро—Вісла, створаны ў XVIII стагоддзі, спыніў сваё існаванне параўнальна нядаўна. Ён быў у рабочым стане аж да пачатку Другой сусветнай вайны. Потым, пасля аднаўлення гідратэхнічных збудаванняў і ўзвядзення глухой плаціны ў Брэсце, воднатранспартнае злучэнне раздзялілася на два ўчасткі — беларускі і польскі. Агульная працягласць шляху складае больш за дзве тысячы кіламетраў. З іх 626 пралягае па вадзе Беларусі.**



Брэсцкі рачны порт.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Паводле ацэнкі спецыялістаў, водны шлях ад Брэста да мяжы з Украінай знаходзіцца ў здавальняючым стане і адносіцца да чацвёртага класа ўнутраных водных шляхоў міжнароднага значэння. Цяпер магістральны Е-40 (частка старажытнага шляху з варагаў у грэкі) выкарыстоўваецца толькі ад Брэста да Херсона па Дняпроўска-Бугскаму каналу, Прыпяці, Дняпры. Участак ад Брэста да Варшавы па рацэ Заходні Буг не суднаходны.

Як аднавіць гэты ўчастак шляху, не раз раіліся спецыялісты зацікаўленых краін. Але ўсе іх пагадненні былі не больш чым пратаколамі аб намерах. Цяпер жа, здаецца, зроблены хоць маленькі, ды канкрэтны крок да ажыццяўлення вельмі важнага праекта. У Брэсце сабраліся прадстаўнікі транспартных міністэрстваў і ведамстваў трох краін і назвалі свой сход Міжнароднай устаноўчай канферэнцыяй і першай сесіяй Камісіі па пытаннях развіцця воднатранспартнага злучэння Балтыйскага і Чорнага мораў Е-40 на ўчастку Днепр — Вісла. Яшчэ ў канферэнцыі бралі ўдзел супрацоўнікі міністэрстваў прыроды і аховы навакольнага асяроддзя, навуковых і даследчых арганізацый, грамадскіх структур.

Намаганні таго вартыя. Гэты праект вельмі цікавы для Еўропы найперш як экалагічны. Таму Еўрасаюз заявіў аб намеры фінансавання значнай яго часткі. І для ўсіх трох краін ён мае, несумненна, эканамічнае значэнне. На брыфінгу для журналістаў **намеснік міністра транспарту і камунікацый РБ Аляксандр ШЫШКО** адзначыў:

— Водны транспарт самы танны і найбольш экалагічны. Важна таксама, што ў выпадку аднаўлення шляху будзе развівацца інфраструктура навокал.

Гэтая думка не раз ілюстравалася на канферэнцыі з дапамогай лічбаў, графікаў, дыяграм. Напрыклад, баржа-пляцоўка грузапад'ёмнасцю 900 тон замяняе 18 вагонаў па 50 тон грузу альбо 45 грузавых аўтамабіляў на 20 тон. А выкіды вуглякіслага газу ў навакольнае асяроддзе ў разліку на тона-кіламетр

**Гэты праект вельмі цікавы для Еўропы найперш як экалагічны. Таму Еўрасаюз заявіў аб намеры фінансавання значнай яго часткі.**

водны транспарт дае ў паўтара раза меншыя, чым чыгуначны, і ў пяць разоў меншыя, чым аўтамабільны, падкрэслівалі навукоўцы. А практыкі адзначалі важную магчымасць для памежных рэгіёнаў Польшчы, Беларусі, Украіны стаць цэнтрам мультымадальных перавозак міжнароднага значэння. Беларускія спецыялісты зазначылі, што можна выкарыстаць унікальны патэнцыял Дняпроўска-Бугскага воднага шляху для развіцця міжнароднага рачнога турызму.

Дарэчы, вядучым партнёрам праекта з беларускага боку з'яўляецца РУЭСП «Дняпроўска-Бугскі водны шлях». Яго генеральны дырэктар Мікалай Кацецкі сказаў, што яны актыўна працуюць з польскімі калегамі. Зацвярджэнне задання на распрацоўку тэхніка-эканамічнага абгрунтавання на аднаўленне воднага шляху запланавана ў Любліне на бліжэйшыя месяцы.

А пакуль у Брэсце сфарміраваны чатыры рабочыя групы па выпрацоўцы неабходных дакументаў. Усё трэба як след пралічыць і прааналізаваць. Эксперты зоймуцца дэталёвай ацэнкай цяперашняга стану шляху, аналізам грузапатокаў і выведуць тэхнічную магчымасць і эканамічную мэтазгоднасць развіцця праекта, а таксама паведамяць пра ўплыў на навакольнае асяроддзе. Пасля гэтага стане магчыма аб'яўляць тэндар на праектаванне.

На канферэнцыі адзначалася, што ў рамках рэалізацыі такога праекта не варта чакаць, што ён хутка акупіцца. Але ён важны як для экалогіі трох краін, так і для іх агульных стасункаў. Таму выглядае як інвестыцыя ў добрасуседскую будучыню.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ АПК: праблемы і рашэнні

# ДАЎГІ ЗАБІРАЮЦЬ УСЁ...

**Першы намеснік старшыні Шклоўскага райвыканкама, начальнік раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід ЗАСЯМЧУК:**

— Згодны з тым, што АПК — гэта бесперапынны ланцужок, у якім трэба ўлічваць усе аспекты. Узяць, напрыклад, малочную галіну. У нашым раёне пабудавана 34 малочнатаварныя фермы, згодна з праграмай асвоена 80% фінансавых сродкаў. А вось маладняку набыта толькі на 27%... Мы апынуліся ў пэўнай фінансавай яме. Акрамя крэдытаў, павінны плаціць працэнты па іх і падаткі, якія таксама вылічаюцца мільярдамі. У выніку мы не можам набыць тыя ж угнаенні, таму што пазыкі і спадарожныя імі ўтрыманні забіраюць усё, што мы паспяваем напрацаваць. Фінансавыя абавязацельствы ў параўнанні з коштам малака выраслі ў разы. Каб мець станоўчы эфект, трэба ўлічваць усе «падводныя камяні» — і даўгі па крэдытах, і працэнты, і падаткі.

■ Стыль жыцця

# ВЕЛАСІПЕД — НЕ АЛЬТЭРНАТЫВА АЎТАМАБІЛЮ, А «ЗДАРОВАЕ ДАПАЎНЕННЕ»

**Каля 1,5 млн уладальнікаў веласіпедаў налічваецца сёння ў Беларусі. А ў сталіцы ўладальнікам веласіпеда з'яўляецца кожны пяты жыхар.**

— Узровень цікавасці да язды на веласіпедзе наўпрост залежыць ад наяўнасці ў населеным пункце развітой інфраструктуры, — лічыць **намеснік дырэктара па развіцці сеткі «Велазона» Ігар Давыдзенка.** — Чым больш у горадзе веладарожак і маршрутаў, тым большая і колькасць веласіпедыстаў. Пад'ём веласіпеднай культуры ўжо закрануў Мінск, а неўзабаве распаўсюдзіцца і на іншыя гарады краіны.

Веласіпедысты складаюць 16 працэнтаў насельніцтва Беларусі. Для параўнання: у Германіі гэты паказчык дасягае 76%, у Даніі — 80%, Швецыі — 64%, Нарвегіі — 61%, Кітаі — 37%. А ў самай «веласіпеднай» краіне свету — Галандыі — на 1 тысячу жыхароў прыпадае 990 веласіпедаў. Беларусы набываюць штогод каля 100 тысяч новых веласіпедаў. Прыкладна 40% з іх знаходзяць сваіх уладальнікаў у Мінску.

Найбольш актыўна асвойваюць веласіпеды мужчыны — яны складаюць каля паловы ўсіх велааматараў у Беларусі. Жанчыны набываюць менш за трэцюю частку веласіпедаў. А вось на дзіцячыя ровары прыпадае кожная пятая пакупка. Найбольш папулярныя ў беларусаў горныя веласіпеды, доля якіх у сучасным велапарку дасягае 70%. На другім месцы — гібрыдныя і дарожныя мадэлі (20%). А на ўсе іншыя мадэлі прыпадае толькі 10% усяго рынку.

Па ацэнках эксперта, колькасць велатурыстаў дасягае ў Беларусі 10 тысяч чалавек.

— Пакуль гэты напрамак толькі фарміруецца: за апошнія гады ў краіне хоць і з'явіліся знакавыя веламаршруты, але цікавасць да іх непараўнальна ніжэйшая, чым да аўтобусных тураў. Звычайна для велавандровак беларусы выкарыстоўваюць горныя або дарожныя байкі. А спецыяльныя турыстычныя веласіпеды на беларускіх дарогах сустракаюцца надзвычай рэдка, — канстатуе Ігар Давыдзенка. — Разам з тым сярод веласіпедыстаў у Беларусі шмат заможных людзей. У адрозненне ад Індыі, дзе веласіпед часцей за ўсё выкарыстоўваюць небагатыя людзі, у Беларусі можна сустрэць на веладарожцы і бізнесменаў, і артыстаў, і менеджараў сярэдняга і вышэйшага звяна.

Цікава, што большую палову ўладальнікаў новых веласіпедаў складаюць аўтамабілісты. Як правіла, ровар яны набываюць не як альтэрнатыву машыне, а як дапаўненне да яе. І робяць гэта не для таго, каб сэканоміць на паліве, а каб заняцца спортам або актыўна адпачываць з сям'ёй.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Беларусь імкліва скарачае разрыў з вядучымі еўрапейскімі краінамі ў галіне веласіпеднай моды і культуры. Усё больш людзей выкарыстоўваюць веласіпед у штодзённым жыцці. Стаўленне да яго змяняецца: цяпер гэта не проста спосаб баўлення вольнага часу, а абавязковы атрыбут здаровага ладу жыцця.

Між іншым, нядаўна ў Мінску і Гродна стартаваў конкурс на самую дружалюбную да веласіпедаў арганізацыю «Дзелавы веласіпед — 2014».

— Стварэнне камфортных умоў для веласіпедыстаў — задача не толькі гарадскіх адміністрацый, але і адказнасць кожнай канкрэтнай арганізацыі перад сваімі супрацоўнікамі, горадам і навакольным асяроддзем, — упэўнены **супрацоўнік энергетычнай праграмы Цэнтра экалагічных рашэнняў Павел Гарбуноў.**

Дружалюбная да веласіпедыстаў арганізацыя — такая арганізацыя, якая стварае зручныя ўмовы для сваіх супрацоўнікаў і наведвальнікаў-веласіпедыстаў. Узяць удзел у конкурсе могуць арганізацыі любой формы ўласнасці і ўстановы адукацыі.

*Пераможцы будуць вызначацца ў наступных намінацыях: «Самая дружалюбная да веласіпедыстаў арганізацыя 2014 года», «Самая дружалюбная да веласіпедыстаў вышэйшая і сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова», «Самая дружалюбная да веласіпедыстаў установа агульнай сярэдняй адукацыі» і «Самая дружалюбная да веласіпедыстаў установа сферы абслугоўвання». Арганізацыі-пераможцы будуць адзначаны дыпломамі, прызамі і атрымаюць банеры пераможцаў для размяшчэння на сваіх рэсурсах.*

*Заяўкі на ўдзел у конкурсе прымаюцца да 24 ліпеня 2014 года на сайце конкурсу www.velo.ecoidea.by.*

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Погляд

# ЛІТОЎСКІЯ ВЫБАРЫ



**11 мая ў Літве прайшлі чарговыя прэзідэнцкія выбары. У адрозненне ад выбараў у многіх краінах, вялікіх сумненняў у тым, хто будзе наступным Прэзідэнтам Літвы, у палітолагаў і насельніцтва не было. Галоўнай інтрыгай было, ці зможа дзейны прэзідэнт, самы папулярны палітык краіны Даля Грыбаўскайтэ выйграць адразу, ці яна зробіць гэта ў другім туры?**



Для перамогі ў першым туры неабходна набраць больш за 50 працэнтаў галасоў выбаршчыкаў. Як паказалі вынікі галасавання, другі тур усё ж будзе. Даля Грыбаўскайтэ набрала ўсяго 45,89 % галасоў, на другім месцы апынуўся кандыдат ад сацыял-дэмакратаў Зігмантас Бальчыціс з 13,63 % галасоў. У выніку менавіта яны будуць змагацца 25 мая за пасаду прэзідэнта краіны. Але ўжо па лічбах відаць, што барацьба будзе відавочна няроўнай, і шанцаў стаць прэзідэнтам краіны, калі не здарыцца нешта экстраардынарнае, у Зігмантаса Бальчыціса практычна няма.

Як атрымалася, што рэйтынгі Далі Грыбаўскайтэ настолькі вялікія, што ніводзін з літоўскіх палітыкаў не ў стане з ёй спаборнічаць? У многіх іншых краінах сітуацыя звычайна процілеглая — на прэзідэнцкіх выбарах ажно да фіналу цяжка зразумець, хто ўсё ж будзе прэзідэнтам.

Акрамя асабістай прывабнасці палітыка ў выніку валодання харызмай і выстройвання правільнага палітычнага іміджу, гаворка ідзе і аб выстройванні прыярытэтаў у перадвыбарчай дзейнасці і рэальнай практыцы ажыццяўлення сваіх паўнамоцтваў. Менавіта ў гэтым заключаецца галоўны сакрэт поспеху Грыбаўскайтэ. Яна канцэнтруецца на выяўленні і вырашэнні найбольш актуальных і злабадзённых сацыяльных праблем краіны, якія ўзніклі або пагоршыліся ў працэсе пераходу эканомікі краіны да рынкавага шляху развіцця.

Акунуўшыся ў бурныя воды рынкавай стыхіі, многія грамадзяне Літвы апынуліся альбо ў складанай жыццёвай сітуацыі, альбо сталі ахвярай злоўжыванняў з боку дзяржаўнага апарату ці камерсантаў.

Для прыкладу можна прааналізаваць сітуацыю з карупцыяй і крокі, зробленыя Даляй Грыбаўскайтэ па барацьбе з ёй. Так, калі паглядзець на гады, папярэднія яе першаму тэрміну ва ўладзе, карупцыя ў Літве стала сапраўднай праказай, якая пашкодзіла ўсе сферы дзейнасці дзяржаўнага апарату і выклікала велізарнае незадавальненне грамадзян краіны. Яе размах сапраўды ўражваў, і пра гэта сама прэзідэнт паведаміла грамадству ў пасланні 2010 года пасля першых выйграных выбараў.

Паводле яе інфармацыі, якая зрабіла глыбокае ўражанне на літоўцаў, па выніках 2009 года па фактах карупцыйных дзеянняў было пачата звыш 700 дасудовых расследаванняў, да суду дайшла прыкладна палова спраў, але ніводзін з хабарнікаў не быў пакараны пазбаўленнем волі. І гэта ў краіне з трохмільённым насельніцтвам! Між тым выдатна вядома, што стрымаць карупцыю можа толькі строгасць і няўхільнасць пакарання. На хвалі народнай падтрымкі Грыбаўскайтэ ўдалося не толькі выявіць праблему, але і зрабіць першыя рэальныя крокі па барацьбе з ёй.

У наступным пасланні 2011 года, аналізуючы статыстыку ўжо за 2010 год, яна адзначыла: «Першы паказчык застаўся такім жа: па факце карупцыйных дзеянняў зноў распачата 700 дасудовых расследаванняў. Аднак за дзеянні, звязаныя з хабарніцтвам, свабоды рэальна пазбавіліся ўжо 18 злачынцаў: 6 — за атрыманне хабару, 12 — за подкуп». Былі зроблены і крокі, якія садзейнічаюць больш паспяховай барацьбе з карупцыяй — падоўжаны тэрміны даўнасці за карупцыйныя злачынствы, уведзена магчымасць канфіскацыі незаконна набытай маёмасці дзяржаўных служачых, прынятыя першыя захады па ачышчэнні праваахоўных органаў ад найбольш адыёзных карупцыянераў.

Вядома, заканамернае і пытанне, чаму, калі ў 2009 годзе Даля Грыбаўскайтэ змагла выйграць выбары ў першым туры з 69% галасоў, то вынікі першага тура выбараў 2014 аказаліся не такімі ўражлівымі? Тут адыгралі ролю і новыя фактары.

Па-першае, паўнамоцтвы Прэзідэнта ў Літве дастаткова моцна абмежаваныя, і па шэрагу пытанняў ён альбо не можа хутка ажыццявіць карысныя ініцыятывы, альбо ўвогуле не здольны дамагчыся іх прыняцця. А гэта ўспрымаецца электаратам як слабасць палітыка і невыкананне сваіх чаканняў ад яго.

Па-другое, віленскі саміт «Усходняга партнёрства» ў лістападзе 2013 года, які планаваўся як трамплін для далейшай кар'еры Далі Грыбаўскайтэ ў вышэйшых органах Еўрасаюза, фактычна праваліўся з-за адмовы Украіны і Арменіі падпісваць дакументы аб асацыяцыі з ЕС. А яшчэ ў 2012 годзе, па звестках службы Gallup, Даля Грыбаўскайтэ знаходзілася на трэцім месцы сярод лідараў ЕС па папулярнасці ў выбаршчыкаў.

Рашэнне перавыбірацца на пасаду прэзідэнта Літвы як на запасную пляцоўку пасля правалу асноўнага плана, вядома, сур'ёзна падарвала пазіцыі ў электарата. Па-трэцяе, бачачы папулярнасць лозунгаў Далі Грыбаўскайтэ, арыентаваных на рашэнне самых надзённых праблем, іх сталі пераймаць і канкурэнты, у прыватнасці, сацыял-дэмакраты. І гэта дазволіла ім адабраць частку галасоў у дзейнага Прэзідэнта.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ІНФЛЯЦЫЯ Ў КРАСАВІКУ — 1,6%

**Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў красавіку ў адносінах да сакавіка склаў 101,6%, да снежня летась — 106,6%, паведамілі рэдакцыі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Такім чынам, цэны на харчовыя тавары ў красавіку ў параўнанні з сакавіком выраслі на 2%, а на нехарчовыя — на 0,4%. У параўнанні са снежнем летась цэны на пэўныя групы тавараў выраслі на 8,3% і 1,8% адпаведна.

Нагадаю, што летась інфляцыя ў нашай краіне была на ўзроўні 16,5%.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## АПЕРАЦЫІ «БАГРАЦІЁН» ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

**Памятны знак, прысвечаны юбілею пачатку аперацыі «Баграціён», будзе ўсталяваны на 71-м кіламетры рэспубліканскай трасы Р-31 Бабруйск — Мазыр.**

Яго аўтар — гомельскі скульптар Валерый Кандраценка. Адліты ў бронзе манумент вышынёй звыш шасці метраў будзе заўважны здалёк. Ён нагадае аб падзеях 24 чэрвеня 1944 года, калі менавіта з тэрыторыі Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці пачыналася аперацыя па вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў «Баграціён». Як расказала **намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Светлагорскага райвыканкама Людміла ГРАБКО,** памятны знак плануецца адкрыць у другой палове чэрвеня. На ім размешчаны барэльефныя партрэты легендарных палкаводцаў Георгія Жукава, Канстанціна Ракасоўскага, Паўла Батава, Міхаіла Панова, а таксама эпізоды, якія адлюстроўваюць пачатак аперацыі «Баграціён». Праектна-каштарысная дакументацыя па ўстаноўцы памятнага знака выраблена за кошт сродкаў, сабраных падчас раённага суботніка. Будаўніча-мантажныя работы і добраўпарадкаванне тэрыторыі ажыццяўляюцца за кошт спонсарскіх сродкаў.

Сёлета для рамонту пахаванняў, помнікаў, надмагільных пліт распараджэннем старшыні Гомельскага аблвыканкама было выдаткавана Br600 млн, за якія плануецца капітальна адрамантаваць 19 аб'ектаў. На дваіх вайсковых могілках будуць усталяваны помнікі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ШЛЯХАМІ «СЛАЎНАГА»

**Пасля рэстаўрацыі ў Магілёве запрацаваў музей школы № 22, дзе сабраны ўнікальныя звесткі пра байцоў спецатрада «Слаўны».**

Гэта адзін з 89 спецатрадаў, якія дзейнічалі непасрэдна на Магілёўшчыне. 70 гадоў таму ў Маскве ён быў укамплектаваны спецыяльна падрыхтаванымі спартсменамі, у тым ліку таварыства «Дынама». Яны займаліся контрразведкай і дыверсіямі непасрэдна ў тыле ворага. На рахунку атрада шмат герачных подзвігаў, разгромленых варожых гарнізонаў. Школьны музей, якому сёлета спаўняецца 30 гадоў, налічвае каля 2-х тысяч экспанатаў — шмат з іх было перададзена непасрэдна ўдзельнікамі «Слаўнага». І каб яны захоўваліся ў належным стане, дзяржаўныя і прыватныя арганізацыі ўнеслі сваю лепту ў аднаўленне гэтага значнага для выхавання падрастаючага пакалення аб'екта. З іх дапамогай закуплены неабходная мэбля і абсталяванне, змянілася драпіроўка, зроблена сучаснае падлогавае пакрыццё, да кожнага стэнда падведзена асвятленне.

— Сёння гэта эталон сучаснага школьнага музея, — падкрэсліў падчас урачыстага адкрыцця **губернатар Магілёўскай вобласці Пётр РУДНІК.** — Вельмі важна, каб музеі баявой славы былі ў кожнай школе, бо яны максімальна набліжаны да моладзі і з'яўляюцца добрай крыніцай патрыятызму.

Гэты школьны музей лічыцца адным з узорных у краіне, за апошнія 4 гады ён неаднаразова станавіўся пераможцам і прызёрам конкурсаў розных узроўняў. Летась яго юная экскурсаводка Вікторыя Гусакова заняла ў рэспубліканскім конкурсе другое месца. А кіраўнік музея Святлана Быструшкіна атрымала дыплом 1 ступені на рэспубліканскай выставе па грамадзянска-патрыятычным выхаванні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## КОЛАС І СПОРТ

**У Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адкрылася выстава «Спорт у сям'і Міцкевічаў», дзе можна пабачыць фотаздымкі Якуба Коласа, яго сыноў, унукаў і праўнукаў падчас заняткаў рознымі відамі спорту.**

Выдатныя стралкі, барцы, лёгкаатлеты — сям'ю Якуба Коласа сапраўды можна назваць спартыўнай. Амаль усе яго дзеці і ўнукі у той ці іншай ступені цікавіліся фізічнай культурай. Спорт у жыцці Якуба Коласа прысутнічаў заўсёды. Падчас Першай сусветнай вайны, напрыклад, Колас быў першым у сваёй роце па стральбе з нагана. Таксама народны паэт часта гуляў у шахматы са сваім сябрам Янкам Купалам. Так, адзін з экспанатаў выставы — шахматы са слановай косці, падараваныя песняру на 70-годдзе. Малодшы сын Якуба Коласа Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч, які прысутнічаў на адкрыцці экспазіцыі, успамінаў пра любімы занятак свайго бацькі — «ціхае паляванне», ці збор грыбоў.



Унучка Якуба Коласа Марыя Міхайлаўна Міцкевіч каля шахматаў са слановай косці, падараваных паэту на 70-годдзе.

Не абмінулі мерапрыемства і знакамітыя беларускія спартсмены. Так, алімпійская чэмпіёнка па спартыўнай гімнастыцы Антаніна Кошаль пажадала прысутным не забываць фізічную культуру, а таксама помніць і ганарыцца нашай спадчынай і тымі людзьмі, якія праслаўляюць Беларусь за мяжой.

**Надзея БУЖАН, фота аўтара.**

## І ТРАСА МІЖНАРОДНАГА ЎЗРОЎНЮ...

**У райцэнтры Гарадок Віцебскай вобласці, які рыхтуецца да правядзення свята «Дажынкі», будзе створана лыжаролерная траса міжнароднага ўзроўню.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім аблвыканкаме, дыяметр знешняга круга трасы — 6 кіламетраў, а малога — 3 кіламетры. Таксама ў райцэнтры створаць добрую базу адпачынку і арганізуюць развітую пляжную інфраструктуру.

Дзякуючы падрыхтоўцы да «Дажынак» атрымліваюць новае жыццё гандлёвыя аб'екты, уключаючы рынак, а таксама ўстановы культуры, адукацыі, медыцыны. Мясцовыя жыхары змогуць наведваць кінатэатр з 3D-абсталяваннем. Акрамя таго, адрамантаваны Дом культуры.

Будзе створана каля дзясятка новых прадпрыемстваў.

Падвялі газ да Езярышча, а ў планах — завяршыць газіфікацыю ўсяго Гарадоцкага раёна.

Улічваючы, што Гарадоччына знаходзіцца на мяжы з Расіяй, у гэтыя дні праз яе тэрыторыю праязджаюць аматары хакея, якія накіроўваюцца ў Мінск на чэмпіянат свету. У раёне пастараюцца зрабіць усё магчымае, каб уражанне ад знаходжання на Віцебшчыне было прыемным. Гасцям гарантаваны самы цёплы прыём.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ВЫСАКАХУТКАСНЫ МАБІЛЬНЫ ІНТЭРНЭТ СПУСКАЕЦЦА... ПАД ЗЯМЛЮ

**Мабільны аператар МТС завяршае работы па актывацыі тэхналогіі 3G на новай станцыі метро «Малінаўка», якая рыхтуецца да запуску ў эксплуатацыю.**

З улікам таго, што на станцыі метрапалітэна аператар задзейнічаў чатыры радыёчастаты, наведвальнікам сталічнай падземкі будуць даступныя высакахуткасны мабільны інтэрнэт, а таксама якасная галасавая сувязь. У зону радыёпакрыцця сеткай трэцяга пакалення ўваходзяць тэрыторыі платформы, уваходаў і выхадаў з новай станцыі.

Як патлумачыў першы намеснік генеральнага дырэктара МТС Яўген Бранцаў, на канцавых прыпынках пасажыры праводзяць больш часу ў параўнанні з транзітнымі станцыямі, што істотна павышае нагрузку на аператара: «Мы выкарысталі максімальныя на цяперашні момант тэхнічныя магчымасці сеткі дзеля камфорту нашых абанентаў, якія карыстаюцца метрапалітэнам».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ДЖАЗАВЫЯ ВЕЧАРЫ Ў МІНСКУ

**З 10 па 24 мая, у перыяд правядзення чэмпіянату свету па хакеі, мінчан і гасцей сталіцы зноў парадуе музычная падзея міжнароднага маштабу — праект «Джазавыя вечары з Банкам БелВЭБ».**

З канцэртамі ў тры суботы месяца — 10, 17 і 24 мая — выступяць вядучыя джазавыя музыканты з 7 краін — Швецыі, Германіі, Польшчы, Латвіі, Вялікабрытаніі, Італіі і Беларусі. Генеральным партнёрам праекта другі год запар выступае ААТ «Банк БелВЭБ».

Канцэрты ў гэтым годзе будуць праходзіць у гасцявой зоне каля Палаца спорту (пр. Пераможцаў, 4). Як вядома, летась «Джазавыя вечары» з аншлагам прайшлі на плошчы Свабоды, каля ратушы. «Тая пляцоўка магла змясціць да 3000 гледачоў. У гэтым годзе ў сувязі з папулярнасцю праекта і вялікім патокам турыстаў у дні чэмпіянату свету па хакеі мы чакаем на канцэртах значна больш гасцей. Канцэртная зона каля Палаца спорту дазволіць змясціць усіх ахвотных», — патлумачыў журналістам прычыну змены месца правядзення канцэртаў дырэктар фонду «Ідэя» Дзмітрый Гмыза. Кожны з трох джазавых вечароў прапануе меламанам выступленне трох музычных калектываў. Пачатак канцэртаў у 20.00.

**Святлана БУСЬКО.**

# ЛІК ПЕРАМОГАМ — АДКРЫТЫ!



**Пасля буйнога паражэння ад амерыканцаў наступны матч беларускіх хакеістаў супраць каманды Казахстана ўспрымаўся як шанц на рэабілітацыю. І хлопцы Глена Хэнлана не падвялі — 4:1 і неабходныя тры ачкі ў кішэні.**

Тым не менш старт паядынку ў нашай каманды не атрымаўся: на пятай хвіліне прапусцілі крыўдную шайбу. А вось у другім перыядзе беларусы амаль што не падпускалі сапернікаў да сваіх варот і пры гэтым самі рэалізавалі два моманты — вылучыліся Андрэй Сцяпанаў і Мікалай Стасенка. Тон апошняй дваццаціхвілінцы задаў Сяргей Касціцын, правёўшы хуткую атаку. А тлустую кропку ў матчы паставіў Аляксей Калюжны, забіўшы сваю першую шайбу на чэмпіянаце за чатыры секунды да фінальнай сірэны!

Пасля матча **капітан беларускай зборнай Аляксей КАЛЮЖНЫ** ў размове з карэспандэнтам «Звязды» распавёў пра тое, як каманда рыхтавалася да гульні з Казахстанам: «Напярэдадні збіраліся з камандай, трэнерскім штабам, праглядалі запісы гульняў «Барыса» (настаўнік зборнай Казахстана Ары-Пека Селін трэніруе «Барыс». **— Аўт.).** І зыходзячы з таго, што яны дэманстравалі ў сезоне, будавалі план на матч. У складзе зборнай Казахстана нічога нечаканага для нас не было. Так, з'явілася некалькі добрых хлопцаў з расійскіх каманд КХЛ, але гэта істотна не паўплывала на іх дзеянні. Пасля папярэдняга паражэння для нас важна было накіраваць спартыўную злосць у правільнае рэчышча, каб не пачаць гуляць жорстка, «фаліць»... Вельмі рад, што ў нас гэта атрымалася».

Дарэчы, **галоўны трэнер беларускай зборнай Глен ХЭНЛАН** таксама адзначыў граматную гульню сваіх падапечных:

— Задаволены лідарамі каманды. Сяргей Касціцын выдатна праявіў сябе на важных адрэзках. Парадавалі абаронцы, асабліва тройка Волкаў-Яфіменка-Угараў.

**— У другой тройцы супраць казахаў згулялі Джэф Плат і Андрэй Стась, а не Аляксандр Кітараў і Андрэй Касціцын, як звычайна...**

— Шчыра кажучы, не вельмі гляджу на спалучэнне троек, больш звяртаю ўвагу на тое, колькі часу хакеіст правёў на лёдзе. Магу вас запэўніць, што ў наступных матчах Андрэй Касціцын атрымае больш часу.

**— У швейцарскім выданні з'явілася інфармацыя пра тое, што вы — пераемнік Шона Сімпсана на пасадзе галоўнага трэнера зборнай Швейцарыі...**





— У гэтым артыкуле няма маіх цытат, выказванняў, каментарыяў, таму што іх, у прынцыпе, быць не можа. Я тут, каб выйграваць са зборнай Беларусі!

# Гульня, якая вартая ўвагі!

**Запоўненыя пад завязку трыбуны «Мінск-Арэны» было не стрымаць, не суцішыць. Яны ўсю гульню апантана гналі беларускіх хакеістаў наперад — да швейцарскіх варот. Гульня, між іншым, сама была не менш класнай, чым антураж: з прыгожымі кідкамі, самаадданымі дзеяннямі хакеістаў і выдатнымі сэйвамі варатароў.**

Яшчэ за дзесяць хвілін да завяршэння паядынку беларусы саступалі 2:3, але прыгожы трапны стрэл Сяргея Касціцына зноў адрадзіў інтрыгу супрацьстаяння. «Забівай!» — пад барабанны бой у тысячы галасоў крычалі заўзятары. Не ведаю, ці пачуў іх Міхаіл Грабоўскі, але як толькі ён атрымаў шайбу, ракетай панёсся да гасцявых варот і эфектыўным прыёмам перайграў Рыта Бэра. 4:3 — галоўным заставалася датрываць да канца, і наша каманда гэта зрабіла. Такі хакей нам патрэбны!

— Сёння хакейны бог быў на нашым баку, — прызнаўся пасля сустрэчы **Уладзімір Дзянісаў, абаронца зборнай Беларусі.** — Мы настройваліся на матч і былі вельмі матываваныя. Такія матчы балельшчыкам падабаюцца.

**Тарас ШЧЫРЫ.**




## «Смачныя» факты чэмпіянату



**Першы гол на чэмпіянаце забіў расійскі хакеіст Сяргей Плотнікаў, які «распячатаў» вароты швейцарцаў на 13-й секундзе стартавага паядынку турніру.**

*Матч-рэванш Расія — Фінляндыя сабраў 13 734 гледачы. Пакуль гэта рэкорд наведвальнасці.*

**Беларускі форвард Андрэй Сцяпанаў, які забіў па адной шайбе ў вароты амерыканцаў і казахстанцаў, уваходзіць у лік лепшых бамбардзіраў турніру.**

*Першай сенсацыяй чэмпіянату стала паражэнне алімпійскіх чэмпіёнаў Сочы, зборнай Канады, ад каманды Францыі. Нечаканасць здарылася ў дзень адкрыцця планетарнага першынства.*

**Беларускія хакеісты — першыя на турніры, каму ўдалося забіць шайбу ў меншасці. На 42-й хвіліне матча Беларусь — Казахстан вызначыўся Сяргей Касціцын.**

*Самы хуткі гол на рахунку чэшскага хакеіста Томаша Гертля. У матчы супраць шведаў форвард зборнай Чэхіі рэалізаваў атаку на 8-й секундзе сустрэчы.*

**Абаронца зборнай Беларусі Уладзімір Дзянісаў правёў 100-ы матч за нацыянальную каманду. У юбілейным матчы супраць казахстанцаў хакеіст аддаў галявую перадачу Аляксею Калюжнаму.**

*Форвард расійскай зборнай Вадзім Шчыпачоў правёў самы небяспечны сілавы прыём першых дзён турніру: сутыкненне з фінскім хакеістам Пека Ёрмака прывяло да шпіталізацыі прадстаўніка суомі. Галоўны трэнер каманды Фінляндыі заявіў, што Ёрмака выбыў да канца чэмпіянату.*

**Факты збірала Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

# «Зычу беларусам добрай гульні»



**З 7 мая па 27 ліпеня ў Мінску гасцюе шоу «Цырк братоў Запашных. Эмоцыі...». Як аказалася, Эдгард ЗАПАШНЫ — не толькі выдатны дрэсіроўшчык, але і заўзяты аматар спорту. Правядзенне ў нашай краіне чэмпіянату свету дазволіла яму падтрымаць любімую зборную.**

— Я «хварэю» ў Мінску не толькі за зборную Расіі, — падкрэслівае Эдгард. — Вось пасля свайго шоу паспеў на трэці перыяд матча Беларусі з ЗША. Безумоўна, у беларусаў атрымаўся не самы лепшы пачатак, але я падкрэслю, для мяне зборная Беларусі з'яўляецца другой камандай, якую я падтрымліваю на чэмпіянаце, і я зычу ёй добрай гульні.

Гэта далёка не першае першынство свету па хакеі, якое я наведваю. Я быў сведкам перамогі зборнай Расіі на чэмпіянаце ў Фінляндыі (2012 год. **— Аўт.).** Асабіста таксама знаёмы з хакеістамі. Цяпер робім разам з братам усё для таго, каб яшчэ паралельна працаваць. Таму і прынялі прапанову Беларускага дзяржаўнага цырка пачаць праграму фактычна ў тыя дні, калі распачнецца хакейны турнір. Сумяшчаю прыемнае з карысным. Я магу хакей глядзець не толькі праз тэлебачанне, але і ўжывую.

**— Як лічыце, ці здолее зборная Расія перамагчы ўсіх тых, хто ёй пагражае?**

— Хакеісты зборнай Расіі прыехалі ў Мінск з іншым настроем, чым былі на Алімпіядзе. І матч са Швейцарыяй прадэманстраваў, што мы можам закідваць у тым ліку і на 13-й секундзе. Акрамя таго, балельшчыкі наўрад ці даруюць зборнай другое правальнае выступленне за адзін год. Ведаю, што ў складзе адбыліся змены. Дай, Божа, каб яны дапамаглі.

Давайце гаварыць шчыра. Канадцы да гэтага першынства не ставяцца так сур'ёзна, як зборная Расіі. Таму тут трэба звяртаць увагу не на Канаду, а на шведаў, фінаў, якія, як і мы, прыехалі сюды «паміраць» і адстойваць гонар свайго сцяга.

**— Цікава, а ў якім узросце вы зацікавіліся хакеем?**

— Я нарадзіўся ў Савецкім Саюзе. І, напэўна, з самага нараджэння стаў заўзятарам зборнай СССР. Мы ўсе любілі хакей, мы ўсе былі выхаваны на ім.

**— Нехта з хакеістаў наведае ваша выступленне ў цырку?**

— Для іх усіх гульня сёння стаіць на першым месцы. І прапаноўваць ім наведаць выступленне было б неяк няправільна. Праўда, яны ведаюць, што мы ў Мінску, і мы будзем рады, калі хакеісты прыйдуць да нас падчас першынства ці пасля яго завяршэння. Аднак гэта наўрад ці здарыцца. Жорсткія камандныя правілы дыктуюць найперш дысцыпліну. Яны цяпер у казарменных умовах. Напэўна, так і павінна быць.

**— Дарэчы, ці адчулі спецыфіку мінскага чэмпіянату свету?**

— Сама атмасфера горада, пачынаючы з аэрапорта, сведчыць, што краіна жыве хакеем. І той спакой, узровень бяспекі, які створаны ў Мінску, прымушае ў далейшым вучыцца ў вас. Па горадзе хадзіць не страшна. Балельшчыкі таксама паводзяць сябе пазітыўна.

# Хакей на манетах



**Да першынства свету па хакеі Нацыянальны банк Беларусі выпусціў 10 тысяч памятных манет.**

— Работа па падрыхтоўцы манет, прысвечаных гэтай падзеі, ажыццяўлялася Нацбанкам на працягу двух апошніх гадоў, — кажа **Аляксандр ПРЫШЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка.** Напрыканцы 2012-га было аб'яўлена пра выпуск у абарачэнне памятных манет «Чэмпіянат свету па хакеі 2014 года. «Мінск-Арэна», а ў 2013 годзе — «Чэмпіянат свету па хакеі 2014. «Чыжоўка-Арэна». Манеты выраблены з серабра, медна-нікелевага сплаву і адчаканены па 5 тысяч штук кожнага наміналу.

— Стаяла задача зафіксаваць на манетах асноўныя спартыўныя пабудовы, на якіх будзе праходзіць чэмпіянат свету па хакеі, — «Мінск-Арэна» і «Чыжоўка-Арэна», — прызнаецца **Аксана НАВАСЁЛАВА, галоўны спецыяліст-мастак Нацыянальнага банка.** — Як нарадзіўся вобраз хакеістаў? Так, я вывучала фотаздымкі, але канкрэтных хакеістаў не адлюстроўвала. Гэта зборны вобраз. Дарэчы, раней я ўжо працавала са спартыўнай тэматыкай. Мая першая манета была прысвечана веласпорту.

Кошт на манеты таксама ўжо вядомы. За сярэбраныя неабходна выкласці 350 тысяч рублёў, а за медна-нікелевыя — 50 тысяч. Набыць іх можна ў падраздзяленнях Нацбанка і камерцыйных банках, якія знаходзяцца непадалёк ад месцаў правядзення спаборніцтваў.

## ДРАНІКІ І «ЛІНІЯ СТАЛІНА»

**Госці чэмпіянату свету па хакеі ўпадабалі нацыянальную беларускую кухню. Самай любімай стравай, і гэта адзначаюць работнікі грамадскага харчавання, з'яўляюцца дранікі.**

Што тычыцца баўлення часу, паводле інфармацыі рэспубліканскага штаба Міністэрства гандлю па арганізацыі гандлёвага і бытавога абслугоўвання, арганізацыі харчавання ўдзельнікаў і гасцей чэмпіянату свету па хакеі, шматлікія госці з задавальненнем наведваюць гістарычны комплекс «Лінія Сталіна». Штодзень удзел у мерапрыемствах, якія арганізуюцца тут, бяруць да 15 тысяч чалавек.

Матэрыялы падрыхтавалі Тарас ШЧЫРЫ, Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ, Сяргей РАСОЛЬКА. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА, Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ ПА ХАКЕІ Ў МІНСКУ

■ Хто лепшы?

# САМЫ-САМЫ!..

## Уладальнікам тытула «Містар Беларусь» стаў 21-гадовы студэнт Акадэміі мастацтваў Кірыл Дыцэвіч

**Менавіта яму 11 мая ў інтэрактыўным галасаванні аддалі перавагу гледачы тэлеверсіі першага ў нашай краіне конкурсу мужчынскай прыгажосці. За званне лепшага з лепшых спаборнічалі 15 фіналістаў, адабраныя з больш як тысячы кандыдатаў з розных куткоў нашай краіны.**



Фота Надзеі БУЖАН.

«Містар Беларусь 2014» Кірыл Дыцэвіч — ураджэнец горада Бярозы, што на Брэстчыне. Хлопец вучыцца на 2-м курсе акцёрскага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і марыць зрабіць кар'еру ў кіно. Дарэчы, радасцю ад перамогі ў конкурсе хлопец падзяліўся найперш з бацькамі і ўрачыста паабяцаў зрабіць усё, каб тыя былі шчаслівымі.

У якасці галоўнага прыза «Містар Беларусь» атрымаў ад арганізатараў — тэлеканала АНТ — падарожжа па Кеніі, куды ўваходзіць палёт на паветраным шары і сафары-тур, падчас якога можна будзе ўбачыць у прыродных умовах экзатычную афрыканскую фаўну. Першы і другі віцэ-містар — гэтыя тытулы дасталіся хірургу з Гомеля, узорнаму сем'яніну і бацьку 4-гадовай дачкі Паўлу Бакanаву і выпускніку факультэта фізкультуры Мазырскага педагагічнага ўніверсітэта, трэнеру па фітнесе Аляксандру Пархімовічу — адзначаны грашовымі ўзнагародамі.

Званне «Містар стыль» атрымаў Сяргей Біндалаў, «Містарам фота» суддзі прызналі Юрыя Луцэнку. «Містарам мужчынская салідарнасць» самі ўдзельнікі назвалі артыста Яна Маерса. Найлепшым атлетам стаў Сяргей Сасноўскі — «Містар фітнес», а ў спартыўных дасягненнях першынство атрымаў Канстанцін Бельскі. «Містар глядацкіх сімпатый» Сяргей Чэрвінскі атрымаў, акрамя глядацкага прызнання, спецыяльны прыз — рамантычныя выхадныя ў Мірскім замку.



**— Ці возьме беларускі «містар» удзел у конкурсе «Містар свету»? —** пацікавіліся мы ў рэжысёра-пастаноўшчыка шоу «Містар Беларусь», кіраўніка дырэкцыі спецпраектаў АНТ Анжэліны Мікульскай.

— На жаль, не — прапанова ад арганізатараў конкурсу «Містар свету» прыйшла да нас запозна, і мы ўжо не паспявалі адправіць заяўку. Але ў будучыні будзем трымаць з імі сувязь, і, думаю, беларусы атрымаюць такую магчымасць.

Дарэчы, пра будучыню. Фестываль прыгажосці плануецца захаваць менавіта ў такім фармаце, як і сёлета: конкурс сярод мужчын, дзяўчат і замужніх жанчын — і надалей праводзіць раз на 2 гады.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

Мы построим «Теплый дом»!

Как построить собственный дом? Вечный вопрос для всех жителей земли. Наша организация предлагает Вам совершенно новое решение проблемы с жильем.
**Дом по канадской технологии — это строительство домов из SIP-панелей и несъемной опалубки!**

Чем уникальны эти технологии?
- **Быстрое возведение** *(от 3 дней до 3 недель)*
- **Энергосбережение**
- **Теплоемкость**
- **Экологичность**
- **Звукоизоляция**
- **Долговечность**
- **Низкая стоимость** *(от 200 долларов за $м^2$ в зависимости от комплектации)*




В современном строительстве производство коттеджей и домов из сэндвич-панелей считается одной из самых популярных технологий быстрого возведения зданий. Эти дома обладают уникальными преимуществами и отличными эксплуатационными характеристиками. Благодаря своим теплоизоляционным свойствам одна панель по теплопроводности заменяет 2,5 метра кирпичной кладки. Дом устойчив к перепадам температур. Его структура дает возможность применения всевозможных традиционных отделок, как внутренних, так и наружных. Строительство из несъемной опалубки ничем не отличается от строительства каменных зданий, при этом дает огромные преимущества, так как стены уже утеплены. Собирается дом как конструктор Lego, армируется и заливается бетоном между двумя стенками из пенопласта, жестко закрепленного между собой вставками. Отделка дома снаружи и внутри — традиционными способами.

Приглашаем к сотрудничеству строительные организации!

*Имеются в продаже недорогие комплекты небольших дачных домов для круглогодичного проживания.*



Общество с ограниченной ответственностью «Стильный дом»
21875, г. Поставы, ул. Космонавтов, 26в, Поставский район, Витебская область.
Тел./факс: (02155) 4-25-80, 5-09-69.
Телефоны для справок: +375 29 713-97-11, +375 44 744-50-15.

ООО «Стильный дом» – это:
- комплекты энергосберегающих жилых домов по проектам заказчика или типовым проектам из SIP-панелей или несъемной опалубки собственного производства
- SIP-панели (применяемые для строительства каркасно-панельных домов)
- блоки несъемной опалубки (стеновые, угловые, фундаментные)
- строительство теплых гаражей из SIP-панелей и несъемной опалубки
- распил древесины
- продажа древесины (половая доска, вагонка, блок-хаус)
- пенопласт всех марок
- дачная, садовая мебель из массива

УНП 390431001

В доме тепло — на душе спокойно!

■ У госці да падпісчыка

# ПА ЖЫЦЦІ — З ЭНЕРГІЯЙ І ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

**На транспартным прыпынку ў Бараўлянах пажылы мужчына ў шэрым касцюме і з кіёчкам у руках пільна ўглядаецца ў людзей, што выходзяць з аўтобуса. «Як прыедзеце, убачыце прыгожага мужчыну — гэта буду я» — «абазначыў» сябе Анастас Лявонцьевіч пры тэлефоннай размове. Усміхаюся пра сябе і рушу насустрач звычайнаму, але не зусім, пенсіянеру.**



Пакаёвыя кветкі — адно з захапленняў гаспадара, хоць назваў большасці з іх ён не ведае.

## «Пакуль рухаешся — жывеш»

Анастасу Семяновічу ідзе ўжо дзявяты дзясятак, але выглядае ён маладзейшым за свой узрост. Ходзіць мужчына так шпарка, што я ледзьве паспяваю за ім, і падаецца, што кій ён трымае толькі «дзеля саліднасці». «Пакуль рухаешся — жывеш», — тлумачыць сваю рухавасць Анастас Лявонцьевіч. І распавядае, што ўвесь час казаў гэта сваёй жонцы (якую называе не іначай, як «мая прыгажуня Веранічка»), з якой прайшоў поплеч усё жыццё — без малога 50 гадоў. Спадарыні Веры не стала два гады таму, пасля працяглай хваробы, падчас якой муж сам апекаваўся жонкай, не даверяючы сядзелкам...

**Партызаны некалькі разоў прыносілі Семяновічам «Звязду». Маленькаму Стасю яна саслужыла службу і ў пасляваенны час: як пайшоў у школу, хлопец рабіў з газеты сшыткі.**

Мой суразмоўца жыве ў пасёлку пад Мінскам на прыгожай вуліцы. Вялікі цагляны трохпавярховы дом, які гаспадар пабудаваў сам, стаіць пасярод дагледжанага ўчастка, абнесенага жывой агароджай з туй. Ля ганка нямецкая аўчарка па мянушцы Люкс лашчыцца і так і рвецца з ланцуга, каб павітаць нас. «Гэта ён радуецца, ён увогуле добры, але можа і паваліць», — кажа пра сабаку Анастас Лявонцьевіч, запрашаючы мяне ў дом.

Час абеду, і гаспадар адразу вядзе мяне за стол. Адмовіцца немагчыма, ды і не хочацца, бо яшчэ з раніцы суразмоўца заінтрыгаваў сваёй фірменнай стравай — бульбай па-бараўлянску. І вось на стале з'яўляецца цэлая патэльня з духмянай смажанай бульбай. «Бяру сярэднюю цыбуліну, драблю, кідаю на патэльню. Туды ж адпраўляю натаркаваную на буйной тарцы моркву. Два разы павярну, потым укідваю парэзаную бульбу. Абавязкова дадаю молаты кроп, соль, пятрушку», — дзеліцца рэцэптам гаспадар. Бульба сапраўды вельмі смачная! Да таго ж пад салёны агурок са свайго агарода. А да ўсяго гэтага Анастас Лявонцьевіч прапаноўвае «пару кропляў»...

## «Я ж братка-беларус»

Між тым, з «пары кропляў», калі выразіцца вобразна, і пачалося знаёмства майго героя са «Звяздой», якое працягваецца ўжо шмат дзясяткаў гадоў. Нарадзіўся ён на Случчыне ў сям'і калгаснікаў, у вёсцы з адметнай назвай Сахалін. У вайну яго бацька забяспечваў партызанаў самагонам: не сакрэт, што «баявыя 100 грамаў» часам былі неабходныя ў тых жорсткіх падзеях, дый у лясных шпіталях ён быў і анестэзіяй, і антысептыкам. «Бацькаў самагонны апарат захаваўся, тая яшчэ хохма!» — усміхаецца Анастас Лявонцьевіч і абяцае знайсці яго падчас наступнага прыезду ў бацькоўскую хату.

**У бібліятэцы Анастаса Семяновіча пачэснае месца займаюць творы беларускіх аўтараў. Такую любоў да свайго мужчына тлумачыць проста: «Я ж братка-беларус».**

Партызаны некалькі разоў прыносілі Семяновічам газету «Звязда». Маленькаму Стасю яна саслужыла службу і ў пасляваенны час. «Як пайшоў у школу, не было на чым пісаць: паперы было не дакупіцца. Тады я браў газету, разразаў і рабіў з яе сшыткі. У мяне быў прыгожы почырк — заўсёды за шкло мае сшыткі ставілі...» — узгадвае Анастас Лявонцьевіч. Увогуле са шматлікіх братоў і сясцёр ён адзін атрымаў поўную адукацыю, у тым ліку вышэйшую. Да навукі і чытання хлопца цягнула заўсёды: ён быў сталым наведвальнікам бібліятэкі і ў дзяцінстве нават спецыяльна хадзіў пасвіць кароў, каб можна было чытаць кніжкі. У сённяшняй уласнай бібліятэцы Анастаса Семяновіча пачэснае месца займаюць творы беларускіх аўтараў і цэлая паліца адведзена пад серыю выданняў «Беларускага кнігазбору». Такую любоў да свайго мужчына тлумачыць проста: «Я ж братка-беларус».

## «Мне заўсёды траплялiся вельмі добрыя людзі»

Скончыўшы «афіцыйна» восем, а насамрэч сем класаў, у 1949 годзе хлопец папрасіўся ў войска. Шэсць гадоў служыў у Германіі, скончыў там партыйную школу... Вярнуўшыся на Радзіму, пайшоў працаваць на Мінскі трактарны завод. А з 1958 года стаў і да сённяшняга дня застаецца адданым падпісчыкам «Звязды», не прамяняўшы любімую газету ні на якія іншыя выданні. «Усім сваім знаёмым раю яе выпісваць. Столькі карыснай інфармацыі пра здароўе пішаце!» — кажа спадар Анастас і дадае, што абавязкова праглядае раздзел спорту, надвор'е, з захапленнем чытае апавяданні маладых аўтараў у «Чырвонай змене», у якой калісьці друкаваўся і сам.

Жыццё прынесла Анастасу Семяновічу каля 40 гадоў працы ва ўпраўленні магістральных газаправодаў (пазней «Захадтрансгаз» і «Белтрансгаз») і званне заслужанага работніка, двух сыноў, ужо дарослых унукаў... І ўвесь гэты час нязменнымі застаюцца жыццёвыя прынцыпы спадара Анастаса.

«Я ніколі не курыў, а вось крыху выпіць і цяпер не адмаўляюся. Здароўе падтрымліваю работай, але працую ў межах разумнага, як казаў бацька: «Ніколі не бяры на пуза».

Ды і хварэць, як прызнаецца мужчына, яму няма калі: ён даглядае агарод — садзіць бульбу, моркву, буракі, памідоры, перцы, агуркі, зяленіва, вырошчвае кветкі (у хаце ўсе вокны застаўлены вазонамі). Анастас Лявонцьевіч кажа, што нікому не дазваляе дапамагаць сабе па гаспадарцы, нават сыноў не дапускае ў грады, бо для яго «адарвацца ад агарода — пакаранне». Апроч таго, спадар Семяновіч трымае курэй, штодня робіць шпацыр з сабакам, а яшчэ ўласнаручна абшывае шалёўкай пакоі ў хаце. Што дапамагае пенсіянеру захоўваць такую жвавасць і прагу да жыцця, можна толькі здагадвацца. Зрэшты, перад развітаннем ён сам даў падказку: «Мне заўсёды ў жыцці траплялiся вельмі добрыя людзі».

**Я ніколі не курыў, а вось крыху выпіць і цяпер не адмаўляюся. Здароўе падтрымліваю работай, але працую ў межах разумнага, як казаў бацька: «Ніколі не бяры на пуза».**

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
**Фота аўтара.**

*Мінскі раён*

■



Штодня спадар Анастас разам з Люксам здзяйсняюць шпацыр па пасёлку.

# ФОРМУЛА ІХ КАХАННЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння яны са сваімі жыццёвымі прынцыпамі, напэўна, выглядаюць дзівакамі, непапраўнымі ідэалістамі і рамантыкамі. Але ў пасляваенны час гэта было так натуральна, нават не прыходзіла ў галаву, што можа быць інакш. Нават на фота, якое юнак падарыў дзяўчыне пасля школы, ён не адважыўся напісаць слова «каханай» — пазначыў проста: «мілай Лідачцы». Але абое адчувалі сябе шчаслівымі, усе астатнія сімпатыі перасталі для іх існаваць. А калі хлопец паступіў у Ленінградскае вышэйшае ваенна-марское інжынернае вучылішча, пачаўся іх прыгожы раман у лістах.



Сапраўднае каханне ніколі не згасае.

## 396 прыступак

Маладыя — пераважна прымхлівыя людзі. А вось Лідзія і Уладзімір не пабаяліся пабрацца шлюбам у панядзелак 13-га.

**Каханне ў 17 гадоў — гэта як наркотык. І трэба не перайсці тую мяжу, за якой яно ператвараецца ў распусту.**

— Калі мы прынеслі ў ЗАГС заяву, нам сказалі, што вельмі вялікая чарга і нас распішуць не раней, чым праз 4 месяцы, — успамінае Лідзія Кірылаўна. — Але ў Валодзі павінна было адбыцца размеркаванне, і без штампа ў пашпарце мы не змаглі б паехаць разам. Нас пашкадавалі. Адна з супрацоўніц, убачыўшы, як мы засмуціліся, нясмела прапанавала: «Калі жадаеце, можам распісаць вас у бліжэйшы панядзелак». Гэта было 13 жніўня, і не знайшлося ніводнай пары, якая б рызыкнула ажаніцца ў такі дзень...

Быць жонкай маладога афіцэра — цяжкае выпрабаванне. Але, калі кахаеш, нічога не страшна. Яны ехалі на далёкі, невядомы Кольскі паўвостраў у Северамóрск, дзе паўгода дзень, паўгода ноч, а сэрцы спявалі — мы разам. Жылля маладым сужэнцам ніхто не абяцаў, але там на месцы, калі даведаліся, што былы курсант прыехаў з жонкай, адразу ж уручылі ключ ад аднаго з трох пакояў разлічанай на некалькі сем'яў кватэры. З выгод там была толькі электрычнасць, а замест пліты на кухні — керагаз. Што такое заставацца адной у гэтых умовах на доўгія два-тры тыдні, калі муж у моры, Лідзія Кірылаўна ведае вельмі добра. Але, кажа, не давала сабе сумаваць. Разам з іншымі, такімі ж, як і яна, маладымі жонкамі займалася гаспадарчымі справамі.

Скардзіцца на нязручнасці нават і думкі не было. Калі чакалі першынца, муж у самы адказны момант знаходзіўся ў плаванні. І яго рашучая жонка, як толькі пачаліся першыя схваткі, адна, без усякіх суправаджальнікаў, сабрала неабходныя рэчы і пайшла пешшу ў радзільны дом. Дарэчы, знаходзіўся ён на высокай сопцы, падняцца на якую трэба было з дапамогай амаль 400 прыступак. Калі дакладна, 396. Гэтая лічба назаўжды засталася ў яе памяці.

## Каханне — гэта дыпламатыя

Так лічаць Лісоўскія. «Нядаўна ён быў у бальніцы і я вельмі сумавала без яго, — прызнаецца жанчына. — Люблю часам пабыць сам-насам са сваімі думкамі, але адзіноты баюся. У майго мужа, як і ва ўсіх, ёсць недахопы, але я ніколі не акцэнтую на іх увагу. Жанчына павінна згладжваць вострыя вуглы, яна ж захавальніца хатняга ачага. Калі муж ставіцца дрэнна, трэба перш за ўсё шукаць прычыны ў сабе. Сваім дзвюм нявесткам кажу: «Дзяўчаты, вы з золата, калі церпіце сваіх мужчын».

**Калі муж ставіцца дрэнна, трэба перш за ўсё шукаць прычыны ў сабе. Сваім дзвюм нявесткам кажу: «Дзяўчаты, вы з золата, калі церпіце сваіх мужчын».**

Вельмі дрэннае пачуццё рэўнасць. І каб яна не разбурыла адносіны, трэба часцей запэўніваць сваю палову, што яна самая лепшая. Захаваць каханне на гады таксама складаная навука. Каб муж не страціў інтарэс, трэба ўвесь час працаваць над сабой, лічыць Лідзія Кірылаўна. Яна не дазваляе сабе з'явіцца перад ім непрыбранай ці дрэнна апранутай. На жаль, жанчынам уласціва пасля жаніцьбы неяк расслабляцца: маўляў, трапіў хлопец у «сеткі» — не вырвецца. Мая суразмоўца і сама прайшла праз гэта ў маладосці. Урокам на ўсё жыццё стала заўвага старэйшай супрацоўніцы: калі хочаш быць каханай, павінна заўсёды заставацца «пры парадзе». Больш аб гэтым яна не забывала. Затое і сёння не перастае чуць ласкавыя прызнанні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Будзь у курсе

## На Украіне цягнікі будуць спыняцца не на ўсіх станцыях

**У адпаведнасці з паведамленнем Дзяржаўнай адміністрацыі чыгуначнага транспарту Украіны, з 10 мая адмяняюцца асобныя прыпынкі міжнародных транзітных пасажырскіх цягнікоў, якія ідуць праз тэрыторыю Украіны, у тым ліку і ў Крым.**

Згодна з інфармацыяй прэс-цэнтра Беларускай чыгункі, для цягніка №100/99 Мінск — Сімферопаль выключаецца пасадка і высадка пасажыраў на станцыях: Харобічы, Гародня, Камка, Шчорс, Мена, Бахмач, Канатоп, Пуцейская, Пуціўль, Варажба, Смародзіна, Паўлаград-1, Сінельнікава, Новааляксееўка, Мелітопаль. Для цягнікоў № 302/301 Мінск — Адлер, № 356/355 Мінск — Мінеральныя Воды, № 390/389 Мінск — Анапа не будзе пасадкі і высадкі пасажыраў на станцыях: Харобічы, Гародня, Шчорс, Мена, Бахмач-Пасажырскі, Канатоп, Пуціўль, Варажба, Смародзіна, Кірыкоўка, Багадухаў, Ізюм, Красны Ліман, Арцёмаўск-2, Нікітаўка, Горлаўка.

Для цягніка №393/394 Полацк — Сімферопаль выключаецца пасадка і высадка пасажыраў на станцыях: Харобічы, Гародня, Шчорс, Нізкаўка, Мена, Дачка, Бахмач-Пасажырскі, Талалаеўка, Ромны, Сула, Рамадан, Харол, Вясёлы Падол, Вербкі, Крамянчуг, Карыстаўка, Куцоўка.

Для беспересадачных вагонаў Мінск — Кішынёў (цягнік № 61/62 Санкт-Пецярбург — Кішынёў фарміравання Малдаўскай чыгункі) выключаюцца пасадка і высадка пасажыраў на станцыях: Оўруч, Карасцень, Жытомір, Бярдзічаў, Ізраілаўка, Мыткі.

У сувязі з вышэйвыкладзенымі зменамі продажу праязных білетаў да названых станцый не будзе. Пасажыры, якія раней набылі іх, могуць звяртацца ў чыгуначныя касы.

Яшчэ чыгуначнікі звяртаюць увагу на неабходнасць планаваць паездкі з улікам змяненняў у руху цягнікоў у зносінах з Украінай і сачыць за абнаўленнем інфармацыі на афіцыйным інтэрнэт-сайце Беларускай чыгункі, а таксама на інфармацыйных стэндах і касах чыгуначных вакзалаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Факт

## Свята прайшло спакойна

**Ва ўрачыстых мерапрыемствах, прымеркаваных да гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, а таксама ў адкрыцці чэмпіянату свету па хакеі ў сталіцы ўзялі ўдзел 750 тысяч чалавек, паведамляе прэс-служба ГУУС Мінгарвыканкама. Ніякіх парушэнняў зафіксавана не было.**

Агульная колькасць удзельнікаў урачыстага шэсця з ускладаннем вянкоў і кветак да мемарыяла Перамогі склала каля 130 тысяч чалавек. Цягам дня ў сталіцы адбылося 26 масавых мерапрыемстваў, прысвечаных Дню Перамогі. Найбольшая колькасць грамадзян узяла ўдзел у святочных мерапрыемствах каля Палаца спорту (каля 190 тысяч), у парках Перамогі (каля 25 тысяч), Чалюскінцаў (каля 23 тысяч), Лошыцкім (каля 11 тысяч), 60-годдзя Кастрычніка (каля 8 тысяч). Увечары святочны салют быў праведзены ў шасці месцах, найбольшая колькасць гледачоў (каля 310 тысяч чалавек) прысутнічала ў парку 50-годдзя Перамогі, на прылеглай да яго тэрыторыі і на праспекце Пераможцаў. У рамках чэмпіянату свету па хакеі ў месцах яго правядзення, а таксама ў зонах гасціннасці прысутнічала больш за 48 тысяч чалавек.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## З юбілеем!

З нагоды 10-годдзя ўтварэння абласной арганізацыі «Белая Русь» у Астравецкім цэнтры творчасці дзяцей і моладзі адбылася раённая гульня «Што? Дзе? Калі?». Арганізатарам і спонсарам турніру, у якім удзельнічалі 5 школьных каманд з Астраўца, Варнян, Гервят і Спондаў, выступіла раённая арганізацыя «Белай Русі». Перамагла каманда «Логас» з Астраўца.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ Спорт-тайм

# ВЫДАТНАЙ КАР'ЕРЫ — ГРОСМАЙСТАРСКІ ПАКАЗЧЫК!

**Пакуль Мінск жыве хакеем, футбольныя баталіі беларускага чэмпіянату перамясціліся на перыферыю. Сталічныя каманды праводзяць выязныя матчы, БАТЭ працягвае тэсціраваць новы стадыён, а «Нафтан» застаецца адзіным клубам без паражэнняў у гэтым сезоне.**

Канкурэнцыя ў першай тройцы лідараў па-ранейшаму моцная. Так, пасля сёмага тура БАТЭ зрушыла з першага радка турнірнай табліцы мінскае «Дынама». Барысаўчане атрымалі пераканаўчую перамогу над «Слуцкам» — 3:0. У матчы забівалі Міхаіл Гардзяйчук, Віталь Радзівонаў і Мікалай Сігневіч. Дарэчы, для выхаванца брэсцкага «Дынама» гэты гол стаў першым за сваю новую каманду. Але ледзьве не галоўнай падзеяй гэтай сустрэчы стала чарговае выдаленне з поля галоўнага трэнера «Слуцка» Юрыя Крата за спрэчкі з арбітрам і сварку з гульцом «жоўта-сініх» Анры Хагушам. Толькі пакуль эксцэнтрычныя ўчынкі футбольнага спецыяліста ніяк не дапамагаюць «цукровай камандзе»...

Брэсцкае «Дынама» на хатнім полі перайграла сваіх калег з Мінска — 2:1. Героем матча стаў Раман Васілюк, які вызначыўся двухсотым голам у кар'еры і стаў лепшым бамбардзірам у гісторыі чэмпіянатаў Беларусі.



Фота Надзеі БУЖАН.

Раман ВАСІЛЮК увайшоў у гісторыю беларускага футбола як найлепшы бамбардзір чэмпіянатаў краіны.

Нечаканай стала перамога «Мінска» над «Нёманам». У дадатковы час вароты гродзенцаў «распячатаў» Аляксандр Макась. Галоўны трэнер «Нёмана» Сяргей Саладоўнікаў назваў паражэнне сваёй каманды трагедыяй. «Роўная гульня, якая павінна была заканчвацца нічыёй. Але саперніку пашанцавала на апошняй хвіліне. Нам таксама яшчэ пашчасціць. Галоўнае, каб такія паражэнні не зламалі каманду».

Сярод іншых вынікаў адзначым упэўненую перамогу «Шахцёра» над «Тарпеда-БелАЗ» — 2:0 і нічыі ў матчах «Белшына» — «Нафтан» (1:1) і «Гомель» — «Дняпро» (0:0).

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

■

■ Ведай нашых!

## У юных фізікаў — «бронза»

Каманда ліцэістаў БДУ заваявала дыплом 3 ступені на Аўстрыйскім турніры юных фізікаў. Турнір уяўляе сабой камандныя спаборніцтвы старшакласнікаў ва ўменні рашаць складаныя задачы, прадстаўляць і абараняць свае вынікі ў навуковых дыскусіях. Спаборніцтвы праводзяцца на англійскай мове. Арганізатарам турніру выступае Даследчы форум юных фізікаў (AYPT). У гэтым годзе ў турніры ўдзельнічалі 14 каманд з Аўстрыі, Беларусі, Ірана, Расіі, Славеніі і Славакіі. У беларускую каманду, якая заваявала «бронзавы» дыплом, увайшлі дзесяцікласнікі Дзмітрый Баранаў, Вераніка Токарава, Антон Русанаў і Ганна Якубовіч. Пры гэтым чацвёрка ліцэістаў сапернічала з камандамі ў складзе пяці ўдзельнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■

■ На свае вочы

# БАЛЕТ НА ВАДЗЕ

## У Мінску прайшоў чэмпіянат краіны па сінхронным плаванні

**Самы прыгожы і, напэўна, самы вытанчаны від воднага спорту, у якім разам сплецены гімнастычныя практыкаванні, танцавальныя рухі і нават балетныя трукі, сабраў у Палацы воднага спорту неабыякавых да атлетычнай прыгажосці. У рамках чэмпіянату краіны дзяўчаты спаборнічалі ў некалькіх відах праграмы: сола, дуэты, групы, камбінаваныя групы. Турнір стаў вельмі важным і для трэнераў, і для спартсменак, бо ён з'яўляецца адборам на чэмпіянат Еўропы, які пройдзе ў жніўні ў Берліне.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Фаварыткамі чэмпіянату сталі дзяўчаты з нацыянальнай зборнай, але паказаць сябе змаглі і маладыя спартсменкі 2000-х гадоў нараджэння. У індывідуальных практыкаваннях чэмпіёнкай Беларусі стала мінчанка Ірына Ліманоўская з сумай балаў 165,0085. Лепшым дуэтам краіны суддзі назвалі Ірыну Ліманоўскую і Вераніку Есіповіч (167,8821). Першае месца сярод груп і камбінаваных груп заваявалі спартсменкі з каманды «Мінск-1», якія прадстаўляюць Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі (Ірына Ліманоўская, Анастасія Палякова, Вераніка Есіповіч, Ганна Шульгіна, Дамініка Цыплакова, Анастасія Тараховіч, Вольга Талейка).

**Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Беларусі па сінхронным плаванні Наталля САХАРУК** падзялілася ўражаннямі ад турніру, распавяла аб беларускім сінхронным плаванні і падрыхтоўцы каманды да чэмпіянату Еўропы:

— Для мяне гэты турнір стаў вельмі знакавым. Паглядзеўшы выступленні, змяніла погляд на некаторых спартсменак. Пакуль не буду называць імёны, але скажу, што склад на будучы чэмпіянат Еўропы ўжо вызначаны. Таксама я ўжо вызначылася і з юніёркамі. Хутка мы прымем удзел у турніры ў Іспаніі, а затым, з 22 па 25 мая, адбудзецца першынство рэспублікі.

**— Чаму на чэмпіянаце краіны былі прадстаўлены толькі мінскія каманды?**

— У рэгіёнах, на жаль, сінхроннае плаванне ў нас пакуль не развіта. Няма магчымасці, не хапае басейнаў. Нядаўна былі пабудаваны новыя палацы спорту ў Гомелі і Брэсце, але там яшчэ толькі набіралі дзіцячыя групы. Каб вырасціць спартсменак да ўзроўню хоць бы чэмпіянату Беларусі, ім неабходна як мінімум 5-7 гадоў. У Мінску ў нас сёння таксама існуюць праблемы. Не хапае дзіцячых трэнераў. Прычына гэтаму такая ж, як і ў астатніх відах спорту, — маленькія зарплаты. Таксама існуе праблема з вадой. Нам не хапае арэнднага часу на паўнавартасныя трэніроўкі. Падводзіць і фінансаванне. Многае даводзіцца аплачваць спартсменкам і іх бацькам. Адзін купальнік каштуе каля трохсот еўра, а нам іх трэба шмат: сольнае выступленне, дуэт, групы і камбінаваныя групы. На ўсё гэта трэба розныя касцюмы.

**— На якія месцы будуць прэтэндаваць нашы дзяўчаты на чэмпіянаце Еўропы?**

— Нам па сілах зачапіцца за шасцёрку лепшых, але і пра медалі мы, вядома, таксама думаем — гэта ж спорт. Каб беларускае сінхроннае плаванне развівалася і займала лідзіруючыя пазіцыі ў свеце, нам неабходна выстаўляць на міжнародных спаборніцтвах усе віды праграмы. Гэта вельмі важна для суддзяў, каб яны ведалі, што ў Беларусі шмат спартсменак і што ёсць з каго выбіраць. Наогул сінхроннае плаванне, я лічу, — гэта самы суб'ектыўны від спорту. Добра, што ў Міжнародным тэхнічным камітэце з'явілася беларуская прадстаўніца — Алена Святлічная, таму спадзяёмся на змены да лепшага ў адносінах суддзяў.

Каб павышаць свой узровень, нам неабходна часцей праводзіць зборы, выязджаць на розныя турніры, праводзіць турніры ў сябе, у Беларусі. Летась мы паспрабавалі правесці адкрыты чэмпіянат Беларусі. Да нас прыязджалі спартсменкі з Літвы і Расіі. Сёлета плануем правесці адкрытае першынство рэспублікі. Аднак для гэтага выбраны не вельмі ўдалы час: ён супадае з чэмпіянатам свету па хакеі. Таму многія краіны не змогуць прыехаць з-за банальнай праблемы: няма дзе размясціцца, усе гасцініцы занятыя. На сёння пакуль пацвердзіла свой удзел у нашым турніры каманда Літвы.

**— Якая атмасфера пануе ў зборнай? Як вы дамагаецеся таго, каб дзяўчаты адчувалі адна адну ў вадзе?**

— У нас вельмі добры калектыў, ніколі не было ніякіх праблем. Дзяўчаты сябруюць і па-за межамі басейна. Часам мы разам ходзім у кіно. Яны збіраюцца і без мяне.

**— Што павінна ўмець дзіця, каб яго можна было прывесці да вас займацца сінхронным плаваннем?**

— Да нас прыходзіць вельмі шмат дзетак, і гэта радуе. Пажадана, каб у дзяўчынкі былі доўгія рукі і ногі, добрая расцяжка і гнуткасць. Уменне плаваць не абавязкова. Нават лепш, калі дзіця прыходзіць не ўмеючы плаваць. Нашы трэнеры спачатку вучаць плаванню, дзяўчаты займаюцца ў зале гімнастыкай, а толькі потым, пастуопова, і сінхронным плаваннем. Наш спорт вельмі прыгожы — на спаборніцтвы заўсёды прыходзіць шмат гледачоў, і гэта не можа не радаваць.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■





1944–2014 70 гадоў вызвалення

# ПЕРАМОГА — АДНА НА ЎСІХ

## У Курску сабраліся ветэраны з большасці былых рэспублік СССР

**Напярэдадні Дня Перамогі ў горадзе воінскай славы Курску адбыўся IV міжнародны гісторыка-культурны форум «Вялікая Перамога, здабытая адзінствам: да 70-годдзя вызвалення Украіны і Беларусі ад фашызму». Сімвалічна, што менавіта сюды, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны ішлі найбольш жорсткія баі і вырашаўся далейшы лёс магутнай дзяржавы, з'ехаліся прадстаўнікі 21 дэлегацыі з краін СНД, Грузіі, Прыбалтыкі, Абхазіі і Паўднёвай Асеціі — упершыню за гісторыю форуму постсавецкая прастора была прадстаўлена поўнасцю.**



Падчас цырымоніі ўскладання кветак да Мемарыяла ў гонар загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Арганізатары форуму — Фонд развіцця «Інстытут еўразійскіх даследаванняў» і Паліталагічны цэнтр «Поўнач — Поўдзень» — падкрэслілі важнасць вывучэння ролі адзінства савецкіх народаў у найбольш знакавых дасягненнях на фронце, подзвігаў працаўнікоў тылу, умацавання гістарычнай памяці аб Вялікай Перамозе. Невыпадкова сярод грамадскіх і палітычных дзеячаў, гісторыкаў і экспертаў, прадстаўнікоў маладзёжных і пошукавых арганізацый у мерапрыемстве ўзялі ўдзел і ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку і ўдзельнік Курскай бітвы — беларус, былы камандзір танка Аляксандр Фень.

На форуме абмяркоўваліся актуальныя пытанні асвятлення Вялікай Айчыннай вайны ў СМІ, шляхі захавання і перадачы агульнай гістарычнай памяці, сучасны стан і перспектывы развіцця маладзёжных патрыятычных праектаў на прасторы СНД. Прадстаўнікі маладзёжных арганізацыі прэзентавалі навуковыя, адукацыйныя і сацыяльныя праекты, звязаныя з ушанаваннем памяці аб Вялікай Перамозе. Гісторыкі і эксперты агучылі ролю навуковай грамадскасці ў даследаваннях праблемных эпізодаў вайны, пытанні папулярызацыі аб'ектыўных гістарычных ведаў і супрацьдзеяння фальсіфікацыі мінулых падзей.

Грамадская супольнасць сёння вымушана адстойваць сваю гісторыю, яшчэ раз даказваць прапісныя ісціны, рабіць усё дзеля таго, каб не дапусціць скажэння мінулых падзей, рэабілітацыі фашызму і прыніжэння ролі савецкага народа ў Перамозе ў Другой сусветнай вайне. Невыпадкова падобныя аргументы сёння гучаць з міжнароднай трыбуны. Найбольш цікавыя і слушныя з іх — і на старонках «Звязды».

### ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА: МІНУЛАЕ

**Яфім ПІВАВАР, рэктар Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта, член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навук, прафесар:**

— Курск — святое месца ў кантэксце Вялікай Айчыннай вайны. Больш чым 70 гадоў таму 400 тысяч жыхароў тут будавалі абарончыя рубяжы, з тылу сюды прыбыла найноўшая тэхніка. Менавіта тады пад Курскам наша краіна паказала, што яе ваенна-эканамічная моц можа пераадолець і нават перамагчы эканоміку фашысцкай Германіі. У бітве пад Курскам удзельнічалі 4 мільёны чалавек — вялізная лічба. На жаль, 860 тысяч салдат загінулі. Буйнымі былі страты і ў тэхніцы: 1,5 тысячы самалётаў, 5 тысяч танкаў і самаходных артылерыйскіх установак, тысячы мінамётаў. Безумоўна, менавіта перамога ў Курскай бітве і контрнаступленне Чырвонай Арміі прывялі да таго, што ўжо ў 1944 годзе былі вызвалены найбольш буйныя гарады і асобныя рэспублікі.

**Аляксандр ЧАЧЫЯ, віцэ-прэзідэнт Акадэміі нацыянальных і сацыяльных адносін Грузіі, акадэмік Расійскай акадэміі сацыяльных навук, доктар палітычных навук, прафесар:**

— 70 гадоў усё чалавецтва з надзеяй і з захапленнем назірала за бяспрыкладнымі па маштабе, аператыўным мастацтве і гераізме вайсковымі аперацыямі Чырвонай Арміі, якія паклалі пачатак вызваленню Еўропы і ўсяго

**У той дзень, калі праводзіўся форум, Савет Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі якраз галасаваў за прыняцце закона, які б аб'яўляў прапаганду і гераізацыю нацызму крымінальным злачынствам. Напрыканцы мерапрыемства стала вядома, што закон быў адобраны і прыняты. Сёння ў Расіі за рэабілітацыю фашызму і фальсіфікацыю падзей Вялікай Айчыннай вайны пагражае да 5 гадоў зняволення.**

свету ад фашысцкага гвалту. Калі ў 1920 — 1930-я гады Савецкі Саюз падаваўся ў Еўропе і Амерыцы як нейкі цэнтр сусветнага зла, як ракавая пухліна на целе чалавецтва, то ўсяго некалькі гадоў нямецка-фашысцкага прыгнёту аказалася дастаткова, каб погляды і еўрапейцаў, і амерыканцаў павярнуліся да Савецкага Саюза, яго арміі як адзінай сіле, здольнай вярнуць гэтым народам права на жыццё і свабоду. Якой цаной далася нашаму народу гэтая вызваленчая місія, добра ведаюць жыхары Курска, памятае шчыльна палітая кроўю курская зямля. Аб цане Вялікай Перамогі памятаюць і беларусы — на дзіва стойкі, мужны і гераічны народ. Увесь свет ведае спаленую Хатынь, але і яшчэ больш за 9200 беларускіх вёсак былі дашчэнту знішчаны фашысцкімі карнікамі. 70 гадоў таму вызвалілі Украіну. Сотнямі тысячамі жыхароў заплаціў за гэта савецкі народ. Чаго толькі каштавала фарсіраванне Дняпра, якое па складанасці і праяўленым гераізме наўрад ці мае аналагі ў гісторыі: 2,5 тысячы чалавек сталі Героямі Савецкага Саюза толькі за гэтую аперацыю.

**Аляксандр КУТУЗАЎ, правадзейны член Акадэміі ваенна-гістарычных навук, прафесар кафедры гуманітарных і сацыяльна-эканамічных дысцыплін Паўночна-Заходняга (Санкт-Пецярбург) філіяла Расійскай прававой акадэміі Міністэрства юстыцыі Расійскай Федэрацыі, доктар гістарычных навук:**

— Народ сам паступова знішчае сваю гістарычную памяць. Элементарны прыклад — блакада Ленінграда. Нямецкія войскі за 18 дзён падышлі практычна да лепшага абарончага рубяжа, а тыя 100 з лішнім кіламетраў, якія заставаліся да горада, яны пераадольвалі на працягу двух месяцаў. Ленінградская бітва атрымала неадназначную ацэнку ў розны час. На Нюрнбергскім працэсе аднаго з відных нямецкіх дзеячаў спыталі, чаму паў Берлін. Ён сказаў: «Берлін паў таму, што не здаўся Ленінград». У гады Вялікай Айчыннай вайны Ленінградскай бітве надавалі такую ж увагу, як і бітве пад Масквой. Затым наступіў 1949 год — і падчас ленінградскай справы было рэпрэсіравана ўсё кіраўніцтва, якое адстаяла горад. І калі сёння пагартаць падручнікі па гісторыі, можна ўбачыць вялізную колькасць шматлікіх бітваў, толькі не Ленінградскую. А, між іншым, у кастрычніку 1941 года з горада пачалі вывозіць усе абарончыя заводы, на якіх, у асноўным, працавалі самі ленінградцы. Памяць аб подзвігу і трагедыі блакаднага Ленінграда заўсёды павінна натхняць нас на шматлікія дзеянні. І калі цяжка, я заўсёды ўспамінаю словы аднаго ленінградскага гісторыка, які на свае сродкі выдаваў кнігі пра блакадны горад у той час, калі кнігі Суворава выходзілі масавымі тыражамі: «Ленінградцы калектыўна паўтарылі подзвіг Матросава: яны сваімі грудзьмі закрылі амбразуру, якая пагражала ўсёй краіне».

### ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА: СУЧАСНАЕ

**Уладзімір ЧАРНОЎ, начальнік Упраўлення Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па міжрэгіянальных і культурных сувязях з замежнымі краінамі:**

— Ужо ў чацвёрты раз мы збіраемся ў такім прадстаўнічым складзе для таго, каб аддаць даніну памяці вялікаму подзвігу народам СССР у гады Вялікай Айчыннай вайны. За гэты час значна павялічылася колькасць краін, якія ўдзельнічаюць у працы форуму, усё больш змястоўнай і насычанай становіцца яго праграма. Пры гэтым пастаяннымі велічынямі застаюцца глыбокая павага і ўдзячнасць удзельнікаў нашых сустрэч да ветэранаў — людзей, якія невераголнай цаной адстаялі мір і дабіліся Перамогі над моцным і небяспечным ворагам. Ветэраны па-ранейшаму застаюцца жывымі прыкладамі мужнасці, сілы і стойкасці. Іх урок для ўсіх нас звязаны з унікальным пачуццём локця, баявога братэрства ўсіх народаў СССР, без якога было б немагчыма прайсці шлях ад Масквы да Берліна. Калі мы гаворым аб тым, што нашы краіны імкнуцца да захавання і спрашчэння агульнай духоўнай і гістарычнай прасторы, разумеем, што гэта ўзаемнае жаданне, якое базіруецца на агульным разуменні гісторыі, агульных героях, агульных подзвігах.

**Расціслаў ІШЧАНКА, прэзідэнт Цэнтра сістэмнага аналізу і прагназавання (Украіна):**

— Дзеянні па дыскрэдытацыі Вялікай Перамогі пачаліся не ўчора і не пазаўчора. У межах інфармацыйнай вайны яны ўжо даўно вядуцца супраць нас і нашай адзінай дзяржавы. Зразумела было, калі яна вялася супраць СССР: розныя сістэмы, ідэалогіі. Але Савецкага Саюза ўжо даўно няма, на ўсёй постсавецкай прасторы камуністычная ідэалогія не з'яўляецца кіруючай і нават запатрабавальнай. Тым не менш інфармацыйная вайна працягваецца. У тым ліку яна накіравана супраць Перамогі. Прычым з тымі, хто супраць нас гэтую вайну вядзе, яе мы заваёўвалі разам. Навошта? А для таго, каб пераможца пасля вайны атрымаў для сябе лепшы свет, чым даваенны. Відаць, наша прысутнасць у гэтым свеце не зусім задавальняе апанентаў. А ўсё таму, што пасля Перамогі нашы народы аб'ядноўваюць дзве рэчы: па-першае, гэта руская мова; па-другое, наша гісторыя — у першую чаргу Вялікай Перамогі. Гэта тое, што і да сённяшняга часу ўмацоўвае нашы краіны і народы як у гістарычным, так і ў палітычным планах. А гэта падабаецца далёка не ўсім. Любая інфармацыйная вайна заканчваецца фізічнымі мерамі ўздзеяння і цалкам рэальнымі смерцямі. Таму, калі мы маем справу з гэтай з'явай, то, як і ў сапраўднай вайне, вораг павінен быць павержаны. Іначай ён адолее нас.

**Канстанцін ЯЦЭНКА, загадчык кафедры гісторыі Курскага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар:**

**2015 год аб'яўлены годам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны ў краінах СНД.**

— Гледзячы на тыя падзеі, якія ў апошні час адбываюцца ва Украіне, часам ловіш сябе на думцы, што Вялікая Айчынная вайна яшчэ не скончылася. Яна працягваецца, толькі ўжо па-іншаму — на полі ідэалагічным, у выглядзе інфармацыйнай вайны. Дык што ж сёння расколвае ўкраінскае грамадства? Галоўная прычына — стаўленне да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Адна частка ўкраінцаў працягвае шанаваць яе герояў — Каўпака, Кажадуба, другая — гераізуе Бандэру і Шукевіча. Усё часцей назіраюцца спробы перапісаць гісторыю вайны. Яна становіцца аб'ектам вострай ідэалагічнай барацьбы, развіваецца маштабная фальсіфікацыя. У першую чаргу назіраецца імкненне перайначыць характар Вялікай Айчыннай вайны. Сёння многія аўтары спрабуюць адлюстраваць вайну як сутычку дзвюх таталітарных чалавеканенавісніцкіх сістэм. Другі кірунак фальсіфікацыі тычыцца вынікаў вайны. Псеўдагісторыкі ўпэўнена сцвярджаюць, што Перамога была марнай і бессэнсоўнай, паколькі за яе была заплачана вельмі высокая цана, і яна прывяла яшчэ да большага ўмацавання таталітарнага савецкага рэжыму. Падобных выказванняў у сучасных публікацыях можна сустрэць даволі шмат.

**Віктар ГУШЧЫН, дырэктар Балтыйскага цэнтра гістарычных і сацыяльна-палітычных даследаванняў, кандыдат гістарычных навук (Латвія):**

— Дзяржаўная палітыка ў Латвіі накіравана на тое, каб выкрасліць памяць аб Вялікай Айчыннай вайне. У прыватнасці, зусім нядаўна паліцыя бяспекі Латвійскай Рэспублікі правяла праверку ў школах, у якіх вядзецца навучанне на рускай мове, і бібліятэках дзеля таго, каб выключыць вучэбныя дапаможнікі ці іншую літаратуру, дзе выкладаецца трактоўка ходу і вынікаў Другой сусветнай вайны, якая супярэчыць дзяржаўнай палітыцы. У нас адключылі тэлеканал «РТР», дзе транслююцца дакументальныя кінастужкі, у тым ліку пра Вялікую Айчынную вайну. Школа з'яўляецца закрытай установай, і, акрамя дзяржаўнай прапаганды, ніякі іншы пункт гледжання сюды трапіць не можа. Нават ветэранам Вялікай Айчыннай вайны забаронены сустрэчы са школьнікамі. Міністэрства адукацыі і навукі ўвогуле прыняло загад, які забараняе перад Днём Перамогі школьнікам і настаўнікам наведваць мерапрыемствы, прысвечаныя святкаванню 9 Мая, пагражаючы пэўнымі пакараннямі за непаслушэнства. Для нас гэта надзвычай вострая праблема. У баях за тую ж Ялгаву 82 чалавекі атрымалі званне Героя Савецкага Саюза. Толькі з кожным годам наша дзейнасць па фарміраванні палітыкі гістарычнай памяці, па захаванні праўды аб Вялікай Айчыннай вайне сутыкаецца з усё больш жорсткім супрацьдзеяннем з боку Латвіі. Літаральна на днях прайшла інфармацыя, што нашы ўлады разглядваюць георгіеўскую стужку як сімвал захопнікаў, а ў той жа час у кніжных крамах у шырокім доступе прадаюцца штодзённікі і календары з нацысцкай сімволікай. Ужо вырасла новае пакаленне латышоў, якое з нянавісцю ставяцца да Расіі, да Перамогі савецкага праўды ў Вялікай Айчыннай вайне, якія лічаць, што пры нацыстах Латвія жыла лепш, чым пры савецкай уладзе. Тое, што сёння назіраецца ва Украіне, у нас адбылося яшчэ раней. Але калі цяпер на сітуацыі ва Украіне сканцэнтравана ўвага практычна ўсяго свету, то ад нас, з самых розных прычын, амаль усе адвярнуліся.

### ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА: ПАМЯЦЬ І БУДУЧЫНЯ

**Ісмаіл АГАКІШЫЕЎ, дацэнт гістарычнага факультэта МДУ імя М.В. Ламаносава:**

— Як сёння выкладаецца гісторыя Вялікай Айчыннай вайны ў сярэдняй школе? Аб той жа Курскай ці Сталінградскай бітвах у падручніках напісана ўсяго некалькі радкоў. У той жа час як роля некаторых краін Еўропы ў Вялікай Перамозе пераацэньваецца. Такім чынам стварыўся вакуум, у якім вырасла новае пакаленне. Як магчыма, што ў краіне, якая перамагла ў той страшэннай вайне, моладзь насіла адзенне з нямецкай свастыкай і крычала: «Хай Гітлер!»? Пры гэтым біла ветэранаў, дзяцей тых, хто ваяваў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Думаю, каб тыя, хто змагаўся супраць Гітлера, у адным акопе дзелячыся апошнімі патронамі і глытком вады, ведалі б, як будуць паводзіць сябе іх праўнукі, ніколі б не паверылі ў гэта. Нам абавязкова патрэбна вярнуцца да гістарычнай памяці, пачаць паважаць сваіх продкаў і тыя каштоўнасці, на аснове якіх нас выхавалі. Не трэба прыдумляць новую гісторыю: яна ўжо ёсць. Застаецца толькі яе памятаць і берагчы.

**Аляксандр ЧАЧЫЯ, віцэ-прэзідэнт Акадэміі нацыянальных і сацыяльных адносін Грузіі, акадэмік Расійскай акадэміі сацыяльных навук, доктар палітычных навук, прафесар:**

— Сёння фарміруецца, становіцца сацыяльна актыўным ужо чацвёртае пасляваеннае пакаленне. Менавіта яму прыйдзецца выбіраць, якім будзе далейшы шлях развіцця нашых народаў. Пашаны, славы, доблесці, працы, патрыятызму, справядлівасці і праўды, якім быў шлях герояў Вялікай Айчыннай? Ці шлях ганьбы, прадажнасці, рабскай пакорлівасці, малпінага перайманне замежнасці? На працягу 25 гадоў перамогі і дасягненні савецкага народа прыніжаліся, аплёўваліся, абгаворваліся. Тэлебачанне, радыё, прэса, мастацкая літаратура, кінафільмы, тэатральныя пастаноўкі — усё было накіравана дзеля таго, каб вытруціць памяць аб велічы і славе, укараніць нянавісць і пагарду да мінулага, выкараніць такія паняцці, як патрыятызм, павагу да памяці продкаў. І што мы маем у выніку? Тое, што пасля 70 гадоў вызвалення Украіны ветэраны маюць права задацца пытаннем: «Мы вызвалілі Украіну ад нямецкага фашызму. А ці вызвалілі мы яе ад фашызму ўвогуле?» Што мы маем у іншых постсавецкіх рэспубліках? Амаль усюды Вялікая Айчынная вайна знікла з выкарыстання — стала Другой сусветнай. У Грузіі і Прыбалтыцы існуюць музеі акупацыі. Прычым не нямецка-фашысцкай, а савецкай! Ва Украіне, у Малдове, Эстоніі маршыруюць эсэсаўцы, а парады ў гонар Дня Перамогі ўвогуле забаронены. Грузіны рушаць помнік Сталіну, узрываюць мемарыял загінулым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Амаль усюды ў афіцыйнай прапагандзе Расія — гістарычны вораг, а Еўропа і Амерыка, якіх ніхто ніколі з нашых продкаў у вочы не бачыў, — гістарычныя сябры. Адсюль выснова: нашы бацькі і дзяды, якія ваявалі з Расіяй, дапамагалі ворагу ваяваць супраць сяброў. Галоўная мэта такой прапаганды — пазбавіць народы агульнай гістарычнай асновы і сумеснага суіснавання. І калі мы разам не абаронім нашу агульную гісторыю, то яе не будзе каму абараняць. Калі Расія не адстаіць праўду аб Вялікай Айчыннай вайне, то будучыя пакаленні і ведаць не будуць пра Вялікую Перамогу. А так быць не павінна.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота аўтара.**
*Мінск — Курск — Мінск.*



Мемарыял у гонар загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны — месца-сімвал для жыхароў горада воінскай славы.

■ Свята пакаленняў

# «ПАКУЛЬ ЁСЦЬ МАЛАДОСЦЬ, ЖЫЦЦЁ НЕ СПЫНЯЕЦЦА»

**Урачыстасць і цеплыня, веліч і камернасць, радасць і смутак — падаецца, такія несумяшчальныя супрацьлегласці панавалі ў актавай зале Міжнароднага ўніверсітэта «МІПСА». Зрэшты, як жа іначай, бо такімі ж несумяшчальнымі былі прага маладога жыцця і смертаносная вайна, памяць герояў якой узгадвалі ў навучальнай установе.**



Рэктар універсітэта Станіслаў Князеў (у цэнтры) разам з ветэранамі Кастрычніцкага раёна Мінска.

Свята, прысвечанае Дню Перамогі, ва ўніверсітэце ладзіцца ўжо не першы год, і сёлета таксама прайшло па традыцыйнай праграме.

«Кожны год мы запрашаем да сябе ветэранаў Кастрычніцкага раёна, ладзім для іх канцэрт, уручаем падарункі. Самаму старэйшаму нашаму госцю 96 гадоў», — паведаміла **выканаўца абавязкаў начальніка аддзела выхаваўчай работы Вікторыя САЦЭВІЧ.**

На жаль, з кожным годам усё менш ветэранаў застаецца побач з намі, і тым большую каштоўнасць набываюць падобныя сустрэчы паміж тымі, хто рызыкаваў сваім жыццём дзеля міру, і тымі, каму гэты мір умацоўваць. Адзначыў гэта і **рэктар універсітэта, доктар юрыдычных навук, прафесар, генерал-маёр Станіслаў КНЯЗЕЎ.** «Так прыемна бачыць у зале нашых маладых таленавітых студэнтаў! Пакуль ёсць маладосць, жыццё не спыняецца, — сказаў ён падчас святочнага канцэрта. — Тыя, хто нарадзіўся пасля вайны, ведаюць цяжар ваенных гадоў па расказах. Аднак мне давялося два гады адваяваць у Афганістане, і я магу меркаваць пра тое, што такое вайна. І як бы хацелася, каб больш ніякіх войнаў не было ў свеце!»

Вайна яшчэ не гатова знікнуць з чалавечай памяці, і таму, каб больш не паўтарыліся тыя страшныя гады, свята Вялікай Перамогі так клапатліва перадаецца з пакалення ў пакаленне. Запрошаныя на мерапрыемства ветэраны не ўтойвалі сваіх эмоцый і спадзяванняў на мірную будучыню. «Я адчуваю гонар і задавальненне ад сённяшняй сустрэчы. Так прыемна, што ў гэтай зале сабралася моладзь, і так добра, што вы не ведалі цяжкасці і жорсткасці вайны», — прамовіў **ветэран Вялікай Айчыннай Уладзімір Сямёнавіч МІРОШНІКАЎ** і распавёў пра некаторыя падзеі, якія яму давялося перажыць, абараняючы Радзіму.

Тыя, хто прынёс на нашу зямлю Перамогу, павіншавалі прысутных са святам, і ўслед за **ветэранам Галінай Рыгораўнай КАСПЯРОВІЧ** уся зала падхапіла знакамітую «Кацюшу». Гледзячы, з якой бадзёрасцю і задорам гэтая гераічная жанчына завяла адну з галоўных песень Перамогі, стала зразумела, чаму вораг не змог зламаць дух савецкіх абаронцаў.

Між тым і студэнты ўніверсітэта не адставалі ад пачэсных гасцей і падарылі ім мноства эмоцый і слёзы радасці, якіх пажылыя людзі не ўтойвалі. На працягу гадзіны ў выкананні студэнтаў гучалі песні — ваенных гадоў і сучасныя, а пары, што закружыліся ў «Выпадковым вальсе», па-сапраўднаму ахуталі гледачоў атмасферай Дня Перамогі, у якой — журба і нязгаслае, як Вечны агонь, спадзяванне.

Пасля канцэрта ўсіх запрасілі на вуліцу, дзе ўжо стаяла палявая кухня з салдацкай кашай і салодкай гарбатай — традыцыйна гэтыя стравы, якія ўжо набылі сімвалічнасць, да свята гатуе адна з мінскіх вайсковых часцей. Пакаштавала той разварыстай грэчкі і я. Але што магу сказаць, акрамя як адзначыць цудоўныя смакавыя якасці? А вось Галіна Рыгораўна ўсклікнула: «Што вы, гэта ж наша каша!» Бадай, гэта найлепшая і самая красамоўная характарыстыка.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК. Фота аўтара**

■ Без тэрміну даўнасці

# УЗНАГАРОДУ ЎРУЧЫЛІ ПРАЗ 70 ГАДОЎ

## Медаль «За адвагу» гвардыі сяржанта Івана Самусенкі ўручылі яго сваякам

**У Гомельскім райвыканкаме расказалі, што ўзнагароду знайшлі мінулай восенню ў Новасакольніцкім раёне Пскоўскай вобласці члены пошукавага атрада «Вышыня». Па нумары на рэверсе валанцёры праз архіў Мінабароны Расіі вызначылі ўладальніка, жыхара Гомельшчыны Івана Пятровіча Самусенку.**



Кіраўнік клуба «Гонар» Юнус Рахматаў уручае стрыечнай сястры беларуса Галіне Уладынцавай медаль і капсулу з зямлёй.

Ён быў прызваны на фронт у 1941 годзе. У 1942-м сувязіста мінамётнага палка ўзнагародзілі медалём «За адвагу». Дажыць да Перамогі Івану не давялося: у 1944-м ён загінуў і быў пахаваны ў брацкай магіле каля вёскі Лукіно Новасакольніцкага раёна. Гомельскія калегі расійскіх пошукавікаў з ваенна-патрыятычнага клуба «Гонар» пазаштатнага цэнтра патрыятычнага выхавання і занятасці моладзі пры в/ч 5525 дапамаглі знайсці сваякоў Івана Самусенкі. Медаль уручылі стрыечнай сястры чырвонаармейца Галіне Уладынцавай падчас мітынгу, што адбыўся ў вёсцы Клімаўка Прыбыткаўскага сельсавета — каля мемарыяла жыхарам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Зямлю з месца пахавання героя падсыпалі ў магілу яго бацькоў. Потым была адслужана паніхіда. А медаль «За адвагу» з гэтага часу будзе захоўвацца ў музеі Клімаўскай сярэдняй школы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

Ігуменскі тракт
№ 16 (74)

■ Раім наведаць

# «СОФ'Я ГАЛЬШАНСКАЯ» ЕДЗЕ НА МАЛУЮ РАДЗІМУ

**Нацыянальны мюзікл з аднайменнай назвай пакажуць у саміх Гальшанах. Адбудзецца гэта 24 мая падчас фестывалю «Гальшанскі замак-2014».**



У 2013 годзе Соф'я ўжо наведвала свае ўладанні.

Нагадаем, што прэм'ера твора адбылася восенню ў Беларускім музычным акадэмічным тэатры. Музыку напісаў Уладзімір Кандрусевіч. Сюжэт разгортваецца вакол жаніцьбы польскага караля Ягайлы, бяздзетнага ўдаўца, які збіраўся пабрацца шлюбам са старэйшай дачкой беларуска-літоўскага князя Андрэя Гальшанскага, аднак перадумаў і вырашыў зрабіць сваёй жонкай сярэднюю дачку. Саперніцтва сясцёр, інтрыгі польскага двара — усё амаль так, як сапраўды было ў Вялікім Княстве Літоўскім у пачатку XV стагоддзя. Нягледзячы на тое, што Соф'і 17, а Ягайлу 70 гадоў, усе зайздросцяць маладой, якая зможа пераехаць у сталіцу і распачаць дынастыю Ягелонаў...



Руіны Гальшанскага замка.

Гэты мюзікл — толькі адна яркая старонка фестывалю. Каля сцен старажытнага замка Сапегаў разгорнецца цэлы сярэднявечны горад. Ужо традыцыйна прадстаўнікі розных рыцарскіх клубаў змогуць памерацца тут сіламі падчас разнастайных турніраў. Чакаецца ўдзел гродзенскага клуба славянскіх адзінаборстваў «Арыдан», Мінскага стралковага клуба лучнікаў BOW'S CLUB і іншых. Конна-гістарычны клуб «Залатая шпора» з Мінскай вобласці прадставіць гледачам тэатралізаванае прадстаўленне «Чатыры эпохі беларускай кавалерыі».

Акрамя таго, падчас фестывалю можна будзе навучыцца фехтаваць і хадзіць на старадаўніх хадулях, пабываць на майстар-класе па кавальскай справе. Ахвотныя ўбачаць, як спрытна артысты экстрым-тэатра «Берсерк» кідаюць нажы і сякеры і нават самі змогуць паўдзельнічаць у іх незвычайных гульнях .

Асаблівы каларыт святу надасць аўтэнтычная сярэднявечная музыка. Капэла беларускіх народных духавых інструментаў «Гуды» і фальклорны ансамбль «Баламуты» Беларускага дзяржуніверсітэта культуры прадэманструюць майстэрства гульні на старадаўніх нацыянальных інструментах: дудзе, акарыне, чаротцы, жалейцы і іншых. Хэдлайнерам выступленняў зноў стане любімы многімі гурт «Стары Ольса», які ўжо неаднаразова выступаў у Гальшанскім замку. Сярэднявечную атмасферу свята дапоўніць выступленне танцавальнага калектыву «Фламея».

Па словах начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ашмянскага райвыканкама Галіны Балінскай, мінулагодні фестываль наведалі 4 тысячы чалавек. Сёлета, калі ўдзел у святе прыме прыкладна 300 артыстаў (і, як вядома, будзе паказаны нацыянальны мюзікл), верагодна, наведвальнікаў будзе яшчэ больш. Прыедуць госці з літоўскага горада Шальчынінкай.

Традыцыйная выстава-кірмаш народных майстроў, а таксама гульнявая пляцоўка для дзяцей і выязны гандаль дапоўняць прыемныя ўражанні ад гэтага дня. Завершыцца ўсё начным вогненным шоу.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ,**
**фота аўтара**

# Маўчанне мінуўшчыны

## Ці дачакаецца рэстаўрацыі ўнікальны помнік міжнароднага і рэспубліканскага значэння?

**Калі ў Мсціславе ад цэнтра горада накіравацца ў бок Замкавай гары, немагчыма абмінуць кармеліцкі касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі, помнік XVII стагоддзя. Белы мураваны храм, што стаіць на ўзвышшы, уражвае сваёй велічнасцю яшчэ здалёк, і справа не толькі ў яго памеры. Такі змог бы стаць упрыгажэннем, жамчужынай любой сталіцы. У ім маглі б ладзіць набажэнствы з удзелам вышэйшых асоб... Зрэшты, калісьці яно так і было. Гледзячы на касцёл (дарэчы, апошні на ўсходзе Еўропы помнік «віленскага» барока), уяўляем, якім значным горадам быў Мсціслаў у часы свайго росквіту і як віравала тут жыццё.**



Старажытны напамін пра слаўную мінуўшчыну Мсціслава.

### ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ ЦІШЫНІ

Пра дату будаўніцтва Успенскага кляштара і касцёла ордэна кармелітаў можна меркаваць толькі па спасылках на дакументы XVII — XVIII стагоддзяў, якія ўжо, на жаль, не існуюць. Мяркуюць, што касцёл быў закладзены ў першай палове XVII стагоддзя на месцы драўлянага храма. Дабудоўваўся ён значна пазней, праз некалькі дзесяцігоддзяў. Таксама вядома, што ў 1746—1750 гадах ён быў істотна перабудаваны архітэктарам Глаўбіцам, частковая перабудова адбылася і ў 1887 годзе.

Цяпер у касцёле засталося каля 25 прыхаджан. Набажэнствы для іх праходзяць у невялікай капліцы пры храме. Унутр жа самога касцёла трапіць выпадае хіба што падчас штогадовага рыцарскага фэсту, што ладзіцца на працягу двух дзён улетку. Увесь астатні час яго дзверы замкнёныя. Справа ў тым, што ў 80-я гады мінулага стагоддзя ў храме распачалася рэстаўрацыя. Унутры ўсё абнеслі рыштаваннямі, пачалі аднаўляць ляпніну... Але, як гэта часта бывае, скончыліся сродкі, і рэстаўрацыю замарозілі на няпэўны тэрмін. Без будаўнічых работ прайшло ўжо больш за 20 гадоў...

Нам пашанцавала: спецыяльна для нас дзверы касцёла адчынілі. Тое, што паўстала перад нашымі вачыма ўнутры, было чароўным і вартым жалю адначасова. Вялізная прастора са стройнымі калонамі і высокімі скляпеннямі, нібы скаваная ад падлогі да столі будаўнічымі рыштаваннямі. А скрозь іх з алтароў праглядаюць белыя пяшчотныя херувімы (іх і некаторыя іншыя элементы ляпніны паспелі адрэстаўраваць) і каляровыя фрэскавыя роспісы, нібы безгалосна паведамляючы: «Мы яшчэ тут! Ратуйце нас, пакуль мы не пабляклі!» Зрэшты, ёсць нейкае таямнічае харавство ў гэтай пышнай напаўзакінутасці (але ні ў якім разе не занядбанасці! Унутры касцёла, нягледзячы на стан зацягнутага рамонту, прыбрана — за парадкам у храме сочаць).

Апроч гэтых выяў, захаваліся не менш цікавыя — насценныя партрэты фундатараў касцёла. «Звярніце ўвагу на сімвал улады — булаву, — паказвае на адзін з партрэтаў **дырэктар Мсціслаўскага раённага гісторыка-археалагічнага музея Уладзімір ШЫЛЯНКОЎ.** — Можна меркаваць, што яе мог трымаць якісьці вялікі князь».

**Фрэскі, апроч рэлігійных, адлюстроўваюць і свецкія сюжэты — такога няма больш нідзе ў Беларусі.**



Навуковы супрацоўнік Мсціслаўскага гісторыка-археалагічнага музея Валянціна ЦІМАШКОВА паказвае рэпрадукцыі касцёльных фрэсак.

Адметныя гэтыя фрэскі тым, што, апроч традыцыйных рэлігійных, яны адлюстроўваюць і свецкія сюжэты — такога няма больш нідзе ў Беларусі. Так дзве з іх яскрава распавядаюць пра падзеі, што адбываліся ў 1654 годзе падчас вайны Расіі і Рэчы Паспалітай, калі рускія войскі пад кіраўніцтвам князя Аляксея Трубяцкога на працягу чатырох дзён асаджалі Мсціслаў. А калі ўзялі горад прыступам, то ўчынілі жорсткую бойню, якая атрымала назву «трубяцкая разня». Тых мсціслаўцаў, хто здолеў тады выратавацца, а таксама іх нашчадкаў, яшчэ доўга звалі «недасекамі»: маўляў, не ўсіх пасеклі. Фрэскі сведчаць і аб тым, што пацярпелі ў той разні і святары.

### СПУСЦІЦЦА Ў ПЕКЛА, УЗНЯЦЦА Ў НЯБЁСЫ...

Праходзячы скрозь храмавыя пакоі (а была тут і трапезная, і бібліятэка, і камора, і яшчэ цэлае крыло, якое не захавалася), уваходзім у памяшканне, у куце якога бялее камін. Па словах дырэктара музея, ён дзейнічае і цяпер.

Некалі ў касцёле было пяць алтароў. «У сем'яў, якія ахвяравалі грошы на яго пабудову, былі свае ксяндзы, якія адначасова маглі весці тут службы», — тлумачыць Уладзімір Шылянкоў.

Апроч таго, касцёл меў арган, на падлозе ляжалі персідскія дываны, а вокны ўпрыгожвалі мазаічныя вітражы. Савецкія ўлады пераўтварылі храм у склад. У сутарэннях захоўваліся бочкі з капустай і саленнямі. Соль настолькі ўелася ў земляную падлогу, што і цяпер працягвае разбураць падмурак... Зрэшты, храм мог увогуле знікнуць, было нават прынята рашэнне аб яго зруйнаванні з-за тых самых фрэсак, якія былі сведчаннем таго, як славянін падымаў руку на славяніна, што зусім не ўпісвалася ў ідэалогію «адзінага савецкага народа». Выратавала касцёл адкрыццё комплексу савецка-польскага сяброўства ў пасёлку Леніна Магілёўскай вобласці, на якое прыехалі высокія госці з Польшчы. Мясцовыя ўлады палічылі, што палякі могуць пажадаць наведаць храм у Мсціславе, і вырашылі яго пакінуць.

...Спускаемся ў сутарэнне. У яго заблытаных лабірынтах чыста і цёмна, і святло ліхтарыка не рассейвае адчуванне містычных дрыжыкаў па скуры. Дырэктар музея пацвярджае маю здагадку пра тое, што ў ранейшыя часы тут была крыпта-пахавальня: у сценах ёсць замураваныя нішы, знаходзілі тут і косткі. У адным з памяшканняў у падлозе адтуліна, пад якой, наколькі магчыма разгледзець у ліхтаровым святле, — пустэча. «Хутчэй за ўсё, там сістэма падземных хадоў», — мяркуе Уладзімір Шылянкоў.

На самы верх трапіць не атрымалася (лаз быў зачынены), нават з «сярэдняга» ўзроўню вежы адкрываюцца шыкоўныя мсціслаўскія краявіды. Зірнуўшы на такое харавство, разумееш, што дзеля гэтага варта жыць і захоўваць спадчыну нашых продкаў. Дарэчы, у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі касцёл ордэна кармелітаў мае катэгорыі ўнікальнага аб'екта міжнароднага і рэспубліканскага значэння.

«Балюча глядзець на тое, у якім ён стане, сэрца крывёю абліваецца», — уздыхае Уладзімір Віктаравіч, і з ім нельга не пагадзіцца.

Але ж, нібы дорачы супакаенне і спадзеў, звонку на адной з белых сцен храма выразна праступае шэры сілуэт укрыжаванага Хрыста, які, колькі сцяну ні тынкавалі, праяўляецца зноў і зноў...

**Звонку на адной з белых сцен храма выразна праступае шэры сілуэт укрыжаванага Хрыста, які, колькі сцяну ні тынкавалі, праяўляецца зноў і зноў...**

Пасля сырых і цёмных падземных памяшканняў выходзім на святло, па пакручастых прыступках караскаемся на касцёльную вежу. Нібы са змрочнага царства мёртвых — у асветленае спадзяваннем неба. І хоць

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**
***Мсціслаўскі раён***



У гэтай капліцы пры касцёле цяпер праходзяць набажэнствы.

■ Вартаўнікі памяці

# КАЛІ ЗЯМЛЯ ГАВОРЫЦЬ

## Якія таямніцы захоўваюць старадаўнія могілкі

**Старажытная цагляная брама з крыжам наверсе нібы падзяляе ракаўскія могілкі на дзве часткі. З аднаго яе боку дагледжаныя магілы роўнымі радамі, тут чыста і нават прыемна, калі можна ўжыць гэтае слова адносна некропаля. А па іншы бок брамы вырастае амаль непралазны зараснік, і карцінка паўстае не горшая, чым у фільмах жахаў. Між тым менавіта там сярод карэння і апалага лісця пакрысе знікае самае каштоўнае — старажытныя пахаванні, а разам з імі — і гістарычная памяць.**

### ЭКСКУРСІЯ НА... НЕКРОПАЛЬ?

Вось ужо амаль 10 гадоў валанцёры прыязджаюць у Ракаў, каб выратаваць мясцовыя могілкі. Першыя работы тут пачаліся ў 2005 годзе, калі некропаль быў уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Праўда, нягледзячы на тое, што комплекс старых праваслаўных могілак XIX стагоддзя цяпер павінен быць пад аховай дзяржавы, аднойчы пахаванні давялося ратаваць ад бульдозераў, што прыехалі раўняць іх з зямлёй.

— Вельмі важна пашпартызаваць пахаванні, каб засталася памяць пра людзей, бо не заўсёды ў архівах можа захавацца інфармацыя пра тых, хто тут жыў раней, — кажа **юрыст і каардынатар ініцыятывы аховы гістарычных могілак Беларусі Вольга СЯМАШКА.**

Пашпартызаваць могілкі — значыць зрабіць іх падрабязнае апісанне: зафіксаваць, расшыфраваць надпіс на кожным надмагіллі, стварыць карту і адзначыць усе іх асаблівасці. Апроч гэтага, па магчымасці, валанцёры расчышчаюць могілкі ад смецця і зарасніку.

— У сучаснай Беларусі могілкі амаль не ўспрымаюцца як месцы памяці ў агульнанацыянальным сэнсе, — мяркуе **гісторык Цімафей АКУДОВІЧ.** — Шануюцца толькі асобныя пахаванні — ці сваякоў, ці вядомых асоб. У нашай краіне амаль не праводзяць экскурсій па цэнтральных некропалях, хаця такая практыка распаўсюджана па ўсім свеце: могілкі Росаў у Вільні, Вавель у Кракаве, Лычакаўскія ў Львове, Навадзявочыя ў Маскве з'яўляюцца важнай часткай турыстычных маршрутаў.




Свежую магілу насыпалі наўпрост каля брамы пад ахоўнай шыльдай.



Андрэй ШУЛАЕЎ вопытнай рукой замалёўвае надмагіллі.

У сувязі з гэтым ініцыятары кампаніі па ахове беларускіх некропаляў прапануюць унесці змены ў закон Рэспублікі Беларусь «Аб пахаваннях і пахавальнай справе», у прыватнасці, увесці паняцце «гістарычнае месца пахавання» і вызначыць спецыяльны рэжым утрымання такіх месцаў. Па словах каардынатараў, гэта дапаможа захаваць памяць пра людзей, якія жылі калісьці на нашай зямлі, а таксама ўнікальныя помнікі архітэктуры некропаляў.

### СПАДЧЫНА З МЕТАЛУ

Але хмызняк і занядбанне — не самая вялікая пагроза для старажытных некропаляў. Справа ў тым, што наўпрост паверх старадаўніх магіл працягваюць узнікаць новыя. Вось і цяпер перад нашымі вачыма, акурат перад старажытнай брамай з ахоўнай шыльдай, якая забараняе праводзіць на могілках пахаванні і весці гаспадарчую дзейнасць, мы ўбачылі свежае пахаванне, якога, па словах валанцёраў, два тыдні таму тут яшчэ не было. Мясцовыя ўлады, з якімі Вольга Сямашка вядзе перапіску, прызналі, што ў справе аховы могілак як гісторыка-культурнай каштоўнасці дапушчаны парушэнні, і паабяцалі прыняць меры — напрыклад, увесці пасаду дырэктара могілак.

Невядома, ці была створаная такая пасада, але першы погляд на гістарычную частку могілак дае падставы ў гэтым сумнявацца. Для таго, каб пачаць пашпартызацыю, нам давялося высякаць кустоўе і дрэвастой — іначай прабрацца да старых надмагілляў было немагчыма. Ды і здагадацца, што паглыблены ў зямлю ці перакулены парослы мохам камень — гэта чыясьці магільная пліта, было складана. Толькі счысціўшы мох і перакуліўшы камень, можна было ўбачыць надпіс: «Пефилія Левановичъ. Жила 82 г. ум. 3 Сентябр. 1909 г.»... На многіх надмагіллях выбітыя фігурныя крыжы і адмысловыя надпісы, якія калісьці сведчылі пра заможнасць нябожчыка і яго сваякоў. Цяпер, занядбаныя, гэтыя сведчанні ўжо мала каго цікавяць, як і тое, хто такая была Пефілія Леванівіч, чым яна займалася і што здзейсніла ў сваім жыцці.

Падчас даследавання старажытных надмагілляў нам пашанцавала на сапраўды ўнікальныя знаходкі: сярод зваленага ў хмызах друзу архітэктар і магістр гісторыі Андрэй Шулаеў распазнаў медныя рэшткі купала капліцы, якая калісьці стаяла на могілках. Шчыра кажучы, гледзячы на пагнутыя кавалкі металу, цяжка паверыць, што яе можна адрэстаўраваць. Але спецыяліст запэўнівае: гэта магчыма. Галоўнае, што такая рэч увогуле нейкім цудам захавалася. Аднак на гэтым цуды не скончыліся: крыху пазней нехта натрапіў на ўрослы ў зямлю кавалак жалеза. Пачалі капаць — і выцягнулі з глебы вялікі каваны ўніяцкі крыж, які, верагодней за ўсё, вянчаў тую самую капліцу. Знойдзеныя каштоўнасці валанцёры перадалі мастаку Феліксу Янушкевічу, вядомаму сваім самым вялікім на Беларусі прыватным музеем.

У планах ініцыятараў кампаніі выданне кнігі пра Ракаў і ракаўскія могілкі, якая распавядзе пра новыя факты з гісторыі паселішча і зможа прывабіць сюды турыстаў; увойдзе ў кнігу і спіс пахаваных на тэрыторыі могілак у XIX стагоддзі. Але пакуль што праца будзе працягвацца, і хто ведае, якія яшчэ таямніцы ракаўскага некропаля прыадкрые зямля.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
**Фота аўтара**
**і з архіва Вольгі СЯМАШКІ.**

**Да ведама**

*Штогод Міжнародны камітэт па помніках і гістарычных мясцінах (ICOMOS) вызначае тэму, якой будзе прысвечаны гэты год. Такім чынам міжнародная супольнасць спецыялістаў звяртае ўвагу чалавецтва на тыя ці іншыя помнікі сусветнай спадчыны, якія часта звычайны чалавек не заўважае, але яны патрабуюць не меншай увагі і догляду, чым егіпецкія піраміды ці Эйфелева вежа. Сёлета ICOMOS абраў досыць складаную тэму — спадчына ўвекавечвання (мемарыялізацыі).*

*У Беларусі створана валанцёрская ініцыятыва па захаванні гістарычных могілак Беларусі. Яе ўдзельнікі збіраюць інфармацыю пра старадаўнія некропалі, фарміруюць базу даных гістарычных пахаванняў, якая існуе і пастаянна папаўняецца на сайце niekropali.by. Апісаннем могілак і ўнясеннем іх у базу даных займаюцца краязнаўцы з розных рэгіёнаў Беларусі. Далучыцца да гэтай справы можа любы ахвотны.*

■ Народныя ўмельцы

## Любімы пояс — для ўнучкі



**Зусім нядаўна, каля двух гадоў таму, пачала ткаць паясы Ірына Дзернакоўская, загадчыца Пяцяўшчынскага сельскага клуба, што ў Мінскім раёне. Але яе вырабы ўжо заслугоўваюць высокай адзнакі.**

— Памятаю, як у дзяцінстве ткала мая бабуля, але ніколі б не падумала, што пачну ткаць сама, — усміхаецца Ірына Зыгмундаўна. — Цяпер жа не магу адарвацца ад сваёй працы... Пояс трэба рабіць з сэнсам: таму думкі пра будучы выраб магу выношваць доўга, нібы дзіця.

За ўвесь час майстрыха саткала каля трыццаці паясоў. Самы знакавы — для нованароджанай унучкі.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

*Мінская вобласць.*



■ На кантролі

# «ЗАПАВЕДНЫЯ»... ПАРУШЭННІ

**Шматлікія парушэнні прыродаахоўнага заканадаўства выявіў Камітэт дзяржкантролю ў дзейнасці Бярэзінскага біясфернага запаведніка. У дачыненні да дырэктара гэтай дзяржаўнай прыродаахоўнай установы заведзена крымінальная справа.**

Падчас праверкі высветлілася, што ў запаведніку рабіліся незаконныя высечкі дрэў — на асабліва ахоўных участках лесу.

— Па пнях устанавілі, што незаконна высечана больш як 5,3 тысячы дрэў. Такім чынам навакольнаму асяроддзю была нанесена шкода ў суме 614 мільёнаў рублёў. А кошт незаконна здабытай драўніны склаў 79,5 мільёна рублёў, — удакладнілі ў Камітэце дзяржкантролю.

Дапускаліся і шматлікія парушэнні парадку вядзення бухгалтарскага ўліку. Так, у пазамінулым годзе ў справаздачы «паказалі» прыбытак — каля 400 мільёнаў рублёў, замест атрыманай чыстай страты — 61,7 мільёна рублёў.

Таксама выяўлены неаднаразовыя факты правядзення незаконных паляванняў, у тым ліку кіруючымі работнікамі ўстановы. Іх дзеяннямі навакольнаму асяроддзю была нанесена шкода ў памеры 24 мільёнаў рублёў.

— Па выніках праверкі па рашэнні эканамічнага суда Віцебскай вобласці іскавыя патрабаванні аб спагнанні з Бярэзінскага біясфернага запаведніка 632 мільёнаў рублёў шкоды і 85,8 мільёна рублёў кошту незаконна канфіскаваных аб'ектаў жывёльнага і раслiннага свету задаволены ў поўным аб'ёме, — падкрэслілі ў кантрольным ведамстве.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Конкурс

# «Убельская ластаўка» на Міншчыне

**Абласны конкурс вакалістаў «Убельская ластаўка» да 195-годдзя з дня нараджэння славутага земляка, кампазітара Станіслава Манюшкі адбыўся ў Чэрвені.**

Форум пачаўся на базе Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра 9-11 мая. У ім прынялі ўдзел 26 канкурсантаў — навучэнцаў вышэйшых музычных навучальных устаноў Беларусі, Літвы, Расіі, Украіны, Чэхіі.

У межах заключных мерапрыемстваў, 12 мая, на радзіме знакамітага кампазітара прайшоў гала-канцэрт пераможцаў і ўручэнне ўзнагарод. Тут выступілі вядучыя майстры сцэны, салісты Нацыянальнага акадэмічнага вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, выкладчыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, члены Саюза кампазітараў, акадэмічныя калектывы Мінскай вобласці.

Творчасць кампазітара ў праграме «Іграем Манюшку» была выканана народнай музычнай капэлай «Ігуменскія крыніцы» Чэрвеньскай дзіцячай школы мастацтваў. Асаблівым падарункам для жыхароў і гасцей свята стала лірыка-камедыйная опера Станіслава Манюшкі «VerbumNobile» («Слова гонару») у пастаноўцы камернага музычнага тэатра «Галерэя». Праект стаў магчымым дзякуючы падтрымцы Музычнага дома «Класіка», Польскага ўніверсітэта ў Мінску і непасрэдна прадзюсара спектакля А. Чахоўскага.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

Квитанцию о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) 1-СУ серии КС № 3605486 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительной в связи с утерей.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО НА ПРАВЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «ГРОДНЕНСКИЙ ЛИКЕРО-ВОДОЧНЫЙ ЗАВОД»

| | Лот № 1 | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Наименование предмета торгов, краткая характеристика** | **Капитальное строение с инв. № 621/С-13699 –** сливной пункт одноэтажный, кирпичный площадью 110,8 кв.м, 1977 г.п.; **капитальное строение с инв. № 621/С-13750** – хранилище зерна башенного типа, 1979 г.п., площадью 127, 2 кв.м в составе: 2 хранилища объемом по 1400 куб.м; 3 металлических ворот общей длиной 12,19 м; калитка металлическая; 2 ограждения общей длиной 293,87 м; **капитальное строение с инв. № 621/С-21021** – цементно-бетонное покрытие площадью 1340 кв.м | | | | |
| **Местонахождение имущества** | Минская обл., Несвижский р-н, г.п. Городея, ул. Вокзальная, 62 и 62/1 | | | | |
| **Информация о земельном участке** | Имущество расположено на земельном участке площадью 0,2921 га с кадастровым номером 624255700001001171, назначение – обслуживание зданий и сооружений | | | | |
| **Начальная цена предмета торгов** | 839 866 651 рубль с учетом НДС | **Сумма задатка** | 25 196 000 рублей | **Условия торгов** | Без условий |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Гродненский ликеро-водочный завод», г. Гродно, ул. Виленская, 22, тел. 8(0152) 77 17 89 | | | | |
| **Сведение об организаторе торгов** | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 77 23 79, 74 49 11 | | | | |
| **Номер счета организатора торгов для перечисления задатка** | р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | **Условия оплаты** | Определяется по согласованию победителя торгов с продавцом при заключении договора купли-продажи | | |
| **Торги состоятся 26 мая 2014 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | | | |
| **Срок подачи документов для участия в торгах** | **По 20 мая 2014 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8** | | | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by** | | | | | |
| Дополнительная информация по телефонам в г. Гродно: 8(0152) 77 23 79, 74 49 11 | Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 07.03.2014 г. № 43 | | | | |

27.05.2014 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня:

1. Об изменении размера уставного фонда и номинальной стоимости акций общества.
2. О внесении изменений и дополнений в устав общества и утверждении устава в новой редакции.
3. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 20.05.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 400022625 Наблюдательный совет.

В **суд Слуцкого района Минской области** поступило заявление о признании безвестно отсутствующим ЧАЙКА Юрия Степановича, 1966 года рождения, проживавшего в деревне Ячево Слуцкого района по улице Центральной, дом 10а.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Чайка Юрии Степановиче, сообщить их суду в течение двух месяцев со дня публикации.

## РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)

► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

### извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ЗАО «АТЛАНТ»

Предлагается к продаже в г. Минске трехэтажное капитальное строение (площадь – 970,8 м²) 1993 года постройки, оснащенное всеми видами коммуникаций, с площадкой для погрузки, разгрузки и хранения железнодорожных грузов (контейнерная площадка, площадь – 3479 м²) с примыкающей железнодорожной веткой, расположенное на земельном участке площадью 0,4826 га. Имеется стоянка для автомобилей. В непосредственной близости находятся автобусная остановка и станция метро «Молодежная».

| Лот № 1 | Служебно-бытовой корпус с контейнерной площадкой с инв. № 500/С-41498 | адрес: г. Минск, пер. Домашевский, д. 4 | Начальная цена с НДС, $ США | Задаток с НДС, $ США | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 234 462 | 12 345 | 5 |

**ОПИСАНИЕ**

Назначение – здание специализированное иного назначения. Наименование – служебно-бытовой корпус с контейнерной площадкой, литер А 3/к. Год постройки – 1993. Число этажей – 3. Площадь застройки – 556 м². Общая площадь – 970,8 м². Фундамент – сборные ж/б блоки. Стены, перегородки – кирпичные. Перекрытия – ж/б плиты. Крыша – мягкая рулонная. Полы – линолеум, плиточные, бетонные. Проемы оконные – двойные деревянные. Проемы дверные – щитовые, металлические. Наружная отделка цоколя – окрашен. Наружная отделка стен – оштукатурены, окрашены. Внутренняя отделка – облицовано плиткой, окрашено, оклеено обоями. Отопление – центральное, чугунные трубы, радиаторы. Водопровод – стальные трубы, от уличной сети. Электроснабжение – скрытая проводка. Канализация, горячее водоснабжение – центральная, чугунные трубы. Вентиляция, ванные, напольные электроплиты, радио, телефон – есть.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,4826 га с кадастровым номером 500000000005003550. Целевое назначение – для эксплуатации и обслуживания здания специализированного иного назначения (служебно-бытовой корпус с контейнерной площадкой). На земельном участке расположено имущество, не выставленное на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

Часть кап. строения с инв. № 500/С-41498 сдается по договору аренды на срок по 31.10.2014 (арендуемая площадь 268,1 м²). Объект находится в плане перспективной застройки г. Минска.

Земельный участок площадью 0,4826 га с кадастровым номером 500000000005003550 сдается по договору аренды ЗАО «АТЛАНТ» на срок по 31.01.2049. Ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений, площадь 0,1224 га.

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
2. Валюта торгов – доллар США.
3. Валюта платежа – белорусский рубль.
4. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта.

Сумма для оплаты Объекта производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) возмещает Продавцу в течение 10 (Десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона:

- определение рыночной стоимости Объекта в размере 6 880 000 (Шесть миллионов восемьсот восемьдесят тысяч) белорусских рублей с учетом НДС 20%;
- расходы, связанные с размещением извещения о проведенном аукционе 25.02.2014 в размере 9 894 468 (Девять миллионов восемьсот девяносто четыре тысячи четыреста шестьдесят восемь) белорусских рублей с учетом НДС 20%;
- затраты Организатора аукциона по организации и проведению аукциона 25.02.2014, признанного несостоявшимся, в размере 9 983 761 (Девять миллионов девятьсот восемьдесят три тысячи семьсот шестьдесят один) белорусский рубль с учетом НДС 20%;
- расходы, связанные с размещением извещения, в размере не превышающем 10 000 000 (Десять миллионов) белорусских рублей с учетом НДС 20%.

6. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона вознаграждение в размере 1% (одного процента) от цены продажи Объекта.

Сумма для оплаты вознаграждения производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на дату подписания протокола о результатах аукциона.

7. Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.
8. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Цель использования Объекта согласно целевому назначению не ограничивается.**

**Аукцион состоится 12.06.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 61.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках не подлежат разглашению.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ЗАО «АТЛАНТ», **проводимом 12 июня 2014 г.**

Задаток, уплаченный участником, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа участника от участия в аукционе.

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений 10.06.2014 в 12.00.**

Заключительная регистрация участников 12.06.2014 с 10.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Бабин Владимир Анатольевич 8 (017) 218-63-02, 8(029) 648-60-18.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (лот) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Солигорскторг» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:**

**ЛОТ № 1:** одноэтажное кирпичное здание склада продовольственных товаров № 1, общ. пл. 1 604,9 кв.м (инв. № 644/С-34916), зеленые насаждения (береза, 5 шт.), расположенное на земельном участке площадью 0,5314 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий – 1. Начальная цена с НДС – **1 976 352 000** бел. руб.; Задаток 10% от начальной цены (197 635 200 бел. руб.);

**ЛОТ № 2:** одноэтажное кирпичное здание мебельного склада, общ. пл. 972,9 кв.м (инв. № 644/С-34933), зеленые насаждения (береза, 2 шт.), расположенное на земельном участке площадью 0,3498 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий – 1. Начальная цена с НДС – **550 636 800** бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (55 063 680 бел. руб.);

**ЛОТ № 3:** подъездной путь к железной дороге протяженностью 405,7 м (инв. № 644/С-50473), расположенный на земельном участке площадью 0,5635 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий – 1. Начальная цена с НДС – **243 331 200** бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (24 333 120 бел. руб.);

**ЛОТ № 4:** здание склада № 6,9 общей площадью 1 724,9 кв.м (инв. № 644/С-2073), расположенное на земельном участке общей площадью 0,3752 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий – 1. Начальная цена с НДС – **3 758 496 000** бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (375 849 600 бел. руб.);

**ЛОТ № 5:** одноэтажное кирпичное административно-хозяйственное здание, общей площадью 104,7 кв.м (инв. № 644/С-46962), зеленые насаждения (яблоня 6 шт., груша 1 шт.), расположенное на земельном участке общей площадью 0,0354 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий – 1. Начальная цена с НДС – **169 075 200** бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (16 907 520 бел. руб.);

**ЛОТ № 6:** одноэтажное кирпичное здание бытового комплекса, общей площадью 42,0 кв.м (инв. № 644/С-34911), расположенное на земельном участке общей площадью 0,0784 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий – 1. Начальная цена с НДС – **68 544 000** бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (6 854 400 бел. руб.);

**Задатки перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **12.06.2014** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.06.2014** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Универмаг «Солигорск» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:**

**- здание «Дом Семейных Торжеств», общ. пл. 1160.1 кв.м (инв. № 644/С-39313), на зем. участке пл. 0,2678 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Железнодорожная, 20;**

**- оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона).**

Условия продажи: сохранение назначения и профиля деятельности объекта в течение пяти лет с момента заключения договора купли-продажи имущества (торговый объект общественного питания).

**Начальная цена с НДС – 8 860 028 400 бел. руб.**

**Задаток 5% от начальной цены (443 001 420 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

*Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 28.12.2013.*

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **26.06.2014 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.06.2014 г. до 16.00** по указанному адресу.

**Тел: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

Утерянный представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случав и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0273546 **считать недействительным.** УНП 100122726

## ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту «12-этажный жилой дом со встроенными помещениями № 31 (по генплану) в микрорайоне Малиновка-6. Встроенные помещения»,** *опубликованную в газете «Звязда» № 81 за 03.05.2014*

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается:**

- 1 (одна) однокомнатная квартира общей площадью 46,48 кв.м на 1-ом этаже жилого дома стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **1 400 долларов США** по курсу, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день оплаты.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованной ранее.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, ул. Короля, 20, к. 2, тел. (017)200-06-85, (044)795-44-44. УНП 190579681

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту «Строительство двух 19-этажных многоквартирных жилых домов со встроенными объектами торгово-общественного назначения в квартале улиц Ржавецкая – ул. Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий. Жилой дом № 1 по генплану»,** ***опубликованную в газете «Звязда» 29.11.2013 года.***

**Застройщик**: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, помещение 3, каб. 4, 6. **Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8(029) 654 10 10.**

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства в жилом доме № 1 по генплану предлагаются 1-, 2-, 3-, 4-, 5-комнатные квартиры.**

Стоимость 1 кв.м **1-комнатных** квартир при оплате в рассрочку 1 550 (одна тысяча пятьсот пятьдесят) долларов США, при 100% единовременной оплате 1 500 (одна тысяча пятьсот) долларов США.

Стоимость 1 кв.м **2-комнатных и 3-комнатных** квартир при оплате в рассрочку 1 450 (одна тысяча четыреста пятьдесят) долларов США, при 100% единовременной оплате стоимость 1 350 (одна тысяча триста пятьдесят) долларов США.

Стоимость 1 кв.м **4-комнатных и 5-комнтантных** квартир (19-20 этаж) при оплате в рассрочку 1 300 (одна тысяча триста) долларов США, при 100% единовременной оплате стоимость 1 250 (одна тысяча двести пятьдесят) долларов США.

По соглашению сторон, оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка. УНП 100070331

## УП «Минский городской центр недвижимости» 17 июня 2014 г. проводит открытый аукцион № 05-Сф-14 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

Минский городской центр недвижимости

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право частной собственности на земельный участок.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляются 7 земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных, блокированных жилых домов в г.Минске (в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества – для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме):

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1. | пер. 2-ой Радиаторный, 16 (Фрунзенский район) | 500000000006007289 | 0,0826 | 1 231 966 610 | 185 000 000 | 8 194 758 |
| 2. | пер. 2-ой Радиаторный, 17 (Фрунзенский район) | 500000000006007195 | 0,0754 | 1 124 579 690 | 169 000 000 | 8 194 758 |
| 3. | Земельный участок № 1 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005469 | 0,0754 | 883 064 750 | 132 000 000 | 2 168 213 |
| 4. | Земельный участок № 22 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005076 | 0,0736 | 861 990 290 | 129 000 000 | 1 864 388 |
| 5. | Земельный участок № 23 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005482 | 0,0733 | 858 469 250 | 129 000 000 | 2 168 213 |
| 6. | Земельный участок № 27 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005372 | 0,0700 | 819 824 110 | 123 000 000 | 1 864 388 |
| 7. | Земельный участок № 32 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005371 | 0,0638 | 747 211 290 | 112 000 000 | 1 864 388 |

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

**Условия, предусмотренные в решении Минского горисполкома о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:**

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного, блокированного жилого дома.

**Аукцион состоится 17 июня 2014 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов)**.

**Для участия в аукционе необходимо:** внести задаток (задатки) **не позднее 11 июня 2014 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:**

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

**дополнительно представляются:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 15 мая по 11 июня 2014 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;

возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минским горисполкомом предоставляется рассрочка внесения платы за земельный участок. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

**При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок** после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся **решение Мингорисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.**

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72,** официальный сайт организатора торгов **www.mgcn.by.**

## Управляющий по делу о банкротстве СООО «Эригал» Монтик Д.Н. – организатор торгов, сообщает о проведении повторных ТОРГОВ по продаже имущества СООО «Эригал»:

| № лота | Наименование лота, его местонахождение | Начальная цена продажи лота | Задаток (5%) |
|---|---|---|---|
| 1 | МАЗ 533702 280, 2005 г.в., г. Лида | 53266032 | 2663302 |
| 2 | Бульдозер Kamatsy D60E-6, 1996 г.в., г. Гродно | 96591195 | 4829560 |
| 3 | Кран МАЗ 5337 КС3577, 1992 г.в., г. Лида | 48307685 | 2415384 |
| 4 | Автомобиль МАЗ 53363, 2000 г.в., г. Лида | 20943788 | 1047189 |
| 5 | Экскаватор ЭО-3323, 1989 г.в., г. Лида | 13254849 | 662742 |
| 6 | Автобус ЛАЗ 695, 1992 г.в., г. Лида | 20236239 | 1011812 |
| 7 | Автобус ПАЗ 3205 40, 2004 г.в., г. Лида | 38499314 | 1924966 |
| 9 | Автомобиль МАЗ 53366, 1997 г.в., г. Лида | 15004519 | 750226 |
| 10 | Автомобиль Мерседес-Бенц 508Д, 1993 г.в., г. Гродно | 50566500 | 2528325 |
| 11 | Автомобиль Ситроен Ксантия, 1999 г.в., г. Лида | 22914657 | 1145733 |
| 12 | Полуприцеп для перевозки автомобилей OPELGGER 32, 1990 г.в., г. Гродно | 46480635 | 2324032 |
| 13 | Прицеп МАЗ 83781, 2001 г.в., г. Лида | 8873809 | 443690 |

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене. Шаг торгов – 5%.

**Торги состоятся 28 мая 2014 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 127/5-411.**

*До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: СООО «Эригал», р/с № 3012140466012 в ЦБУ 401 ОАО «БПС-Сбербанк», МФО 153001369, УНП 590619574.*

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления **до 12.00 27.05.2014** по адресу: 230026, г. Гродно, пр-т Я. Купалы, 45-51 или по факсу 8(0152)530715. Срок возможного отказа от проведения торгов – до 23.05.2014.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. После окончания торгов с победителем подписывается протокол и заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. В соответствии с п. 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Настоящее объявление содержит лишь общие характеристики предмета торгов. Получить полную информацию о порядке и условиях проведения торгов, о предмете торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 18.00 по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 127/5-411, тел. 8(029)6309211, тел./факс 8(0152)530715. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 18.00.

■ З вяртаннем!

# Тэа ў Мінску сустракалі з песнямі і танцамі

**Вечар 11 мая ў Нацыянальным аэрапорце выдаўся багатым на эмоцыі. Тут сустракалі Тэа (Юрыя Вашчука), які прадстаўляў сёлета Беларусь на міжнародным конкурсе «Еўрабачанне 2014». Кветкі, плакаты, апладысменты — так чакалі свайго героя прыхільнікі.**


У Мінску Тэа і ўсю беларускую каманду чакаў гарачы прыём.

Рэйс з Парыжа, якім павінен быў прыляцець спявак з беларускай дэлегацыяй, затрымліваўся, але гэта не зніжала градус настрою прысутных. Каля ста чалавек спявалі добра вядомы «Чызкейк», паўтаралі ў танцы яго знакамітыя рухі, а некаторыя паміж сабой абмяркоўвалі конкурс. Варта было адчыніцца дзвярам тэрмінала, з якога чакалі выхаду Тэа, як натоўп узарваўся апладысментамі, свістам і выкрыкамі яго імя, што прыемна здзіўляла пасажыраў. Калі, нарэшце, дачакаліся самога артыста, то радасць публікі перадалася і яму.

— Дзякуй за вашу падтрымку! Гэта вельмі дапамагае і дае сілы, — прывітаў прысутных Тэа. І на стомленым твары з'явілася ўсмешка, а ў вачах — прыемнае здзіўленне.

Акружаны колам прыхільнікаў, большасць якіх складалі дзяўчаты, спявак прымаў віншаванні, фатаграфаваўся і раздаваў аўтографы. Пад канец нават паспяваў і станцаваў з некаторымі.

— Вярнуўся з думкай, што вось нарэшце я дома. Гэта ж фінал пяцімесячнай працы, а апошнія чатыры дні выдаліся асабліва цяжкімі: прагон другога паўфіналу, сам паўфінал, прагон фіналу. Нашы артысты спалі ў грымёрцы, і добра, калі на канапе можна было прылегчы... Таму вельмі хацелася вярнуцца на радзіму. Прычым вярнуцца так, як я: мяне сустрэлі вельмі цёпла і гасцінна. Здорава! Вось бы заўсёды так вяртацца! — падзяліўся з прысутнымі журналістамі Тэа. — Падтрымка адчувалася нават на адлегласці. Жадаю ўсім артыстам, якія будуць ехаць на «Еўрабачанне», каб слухачы і гледачы да іх ставіліся з такой жа цеплынёй. Тады ў іх усё абавязкова атрымаецца.

Наконт бліжэйшых планаў і верагоднасці вярнуцца на «Еўрабачанне» артыст выказаўся лаканічна: «Хочацца выспацца. Я толькі вярнуўся з конкурсу, таму думкамі яшчэ там. Але хто яго ведае, ці будзе наступны раз...»

**Алена ДРАПКО**

# «ЕЎРАБАЧАННЕ-2015» ПАКОЦІЦЦА КАЎБАСКАЙ... У АЎСТРЫЮ

## А наш прадстаўнік паўтарыў адзін з лепшых вынікаў за ўсю гісторыю ўдзелу Беларусі ў конкурсе

**59-ы па ліку міжнародны песенны конкурс песні завяршыўся сенсацыяй. Бо перамогу ў ім атрымаў персанаж як мінімум неадназначны — «аўстрыйская сасіска» Канчыта Вурст, а па-за сцэнай 25-гадовы юнак Том Нойвірт. Бліжэйшыя сапернікі — дуэт з Нідэрландаў — адсталі ад лідара гонкі на 52 балы. Яшчэ 20 балаў саступіла ім спявачка са Швецыі. Прадстаўнікі Арменіі і Венгрыі, якія да апошняга дня хадзілі ў фаварытах «Еўрабачання», апынуліся на 4 і 5 месцах. адпаведна.**




Том Нойвірт і яго альтэр эга Канчыта Вурст: а вам які вобраз больш даспадобы?

У эпатажным вобразе жанчыны з барадой аўстрыец выступае з 2011 года. У 2012-м ужо як Канчыта браў удзел у нацыянальным адборы на «Еўрабачанне» — заняў 2-е месца. Паводле афіцыйнай версіі, гэты дзіўны вобраз з'явіўся на свет таму, што Том у падлеткавым узросце падвяргаўся траўлі і дыскрымінацыі. Прэса і публіка дагэтуль губляюцца, як трэба называць трыумфатара «Еўрабачання» — «ён» ці «яна». А на афіцыйным сайце выканаўцы падкрэсліваецца, што Том і Канчыта — два розныя чалавекі з уласнымі лёсамі, якія, тым не менш, «працуюць у зладжанай камандзе». Канчыта нават мае асобную біяграфію, паводле якой родам яна з Калумбіі, дзяцінства правяла ў Германіі і ўжо тры гады як замужам за танцорам бурлеск-шоу. Дарэчы, нават у роднай Аўстрыі далёка не ўсе ацанілі гэткую піяр-знаходку: больш чым 30 тысяч чалавек выказаліся супраць таго, каб Канчыта Вурст прадстаўляла краіну на «Еўрабачанні», аб чым і склалі адпаведную петыцыю... Тым не менш, на конкурсе Аўстрыя перамагла, прычым з бляскам і вялізным адрывам — як у сваім паўфінале, так і ў фінальным шоу. Да рэкордных 387 балаў пераможцы «Еўрабачання-2009» Аляксандра Рыбака справа, натуральна, не дайшла, але ў барадатай жанчыны 13 найвышэйшых ацэнак і 290 выніковых балаў. Зусім не далі балаў Аўстрыі ў фінале ўсяго 4 краіны з 36, якія ўдзельнічалі ў галасаванні, — у тым ліку і Беларусь.

А менеджар артыста Рэнэ Берто на прэс-канферэнцыі пераможцы прапанаваў усім змяніць вобраз мыслення і адзначыў, што «Канчыта — проста жанчына з барадой, а мы рады будзем бачыць усіх на Еўрабачанні-2015 у Вене». Дарэчы, Аўстрыя раней выйгравала конкурс усяго аднойчы — у 1966 годзе.


Прадстаўнік Венгрыі Андраш Калай-Сандэрс з песняй, прысвечанай праблеме насілля ў сям'і, стаў на «Еўрабачанні» 5-м.

Фрык-парад, у які вылілася сёлетняе шоу, можа падабацца або не падабацца — гэта цалкам нармальна і зразумела. Можна не пагаджацца з вынікамі або наогул ігнараваць «Еўрабачанне» ў будучыні. Але, як мы памятаем, пераможцаў не судзяць. Будзем шчырымі: хто б заўважыў і вылучыў сярод усіх удзельнікаў «аўстрыйскую бандзіяну» — баладу «Rise like a Phoenix», калі б не барада на жаночым твары выканаўцы? Тым больш, «не зусім жанчын і не зусім мужчын» на конкурсе заўжды хапала: у 1998 годзе «Еўрабачанне» ўжо выйграваў не менш эпатажны канкурсант — Дана Інтэрнэшнл з Ізраіля; у 2002-м трое мужчын, пераапранутых жанчынамі, прадстаўлялі Славенію, а ў 2007-м не адзін скандал разгарэўся вакол персанажа Веркі Сярдзючкі, якой, тым не менш, публіка і журы аддалі 2-е месца. Дык, можа, пакінем кесару кесарава і не будзем блытаць конкурсы эстрадных вакалістаў з тэлешоу?

### РЭПЛІКІ Ў САЦСЕТКАХ

**Уладзімір МАКСІМКАЎ, прадзюсар, кіраўнік першага беларускага адбору на «Еўрабачанне»:** *«Гэта не зусім песенны конкурс (і ўжо дакладна не музычны) і не зусім трансвестыт».*

**Анатоль ЧЭПІКАЎ-ДЗЯНІСАЎ, дырэктар радыёстанцыі «Пілот-FM»:** *«Тое, што пераможа Аўстрыя, было зразумела, Уладзімір Кубышкін не дасць схлусіць, я пра гэта сказаў адразу пасля нумара ў паўфінале, не чакаючы вынікаў... Усё моцна і прафесійна. Маральны бок пакінем у спакоі. Гэта шоу-бізнес...»*

**Ніна БАГДАНАВА, спявачка, тэлевядучая:** «Хто я, Дзед-Барадзед... Ці ўсё-такі баба?»

**Яўген АЛЕЙНІК, прадзюсар, кампазітар, член нацыянальнага журы «Еўрабачання»:** *«Скажу шчыра: я песню скачаў за некалькі месяцаў да таго, як даведаўся пра бараду, бо песня класная... А самым вялікім плюсам «Еўрабачання» для беларускіх артыстаў з'яўляецца магчымасць павысіць узровень свайго сцэнічнага майстэрства ў разы за кароткі час. Гэта многім незразумела, але кажу вам: на конкурсе адбываецца нерэальны скачок прафесіяналізму. Юру віншуем з выдатным вынікам!»*

### ЯК ГАЛАСАВАЛІ БЕЛАРУСЫ?

У паўфінале вышэй за ўсіх беларусы ацанілі Грэцыю (12 балаў), а ніжэй за ўсіх — Македонію (1 бал). Аўстрыі, дарэчы, мы аддалі 7 балаў, а ўзамен атрымалі ажно 10.

У фінале конкурсу 1 бал Беларусь паставіла Румыніі, 2 — Нідэрландам, 3 — Азербайджану, 4 — Нарвегіі, 5 — Венгрыі, 6 — Грэцыі, 7 — Польшчы, 8 беларускіх балаў атрымала Украіна, 10 — Арменія і 12 — Расія.

### ЯК АЦАНІЛІ БЕЛАРУСЬ?

У другім паўфінале Беларусь набрала 87 балаў, у тым ліку па 12 — ад Грузіі і Літвы, і заняла 5-е месца, з якім упэўнена прайшла ў фінальную частку конкурсу.

За фінальнае выступленне беларусам далі балы Ізраіль і Чарнагорыя (па 1), Літва (3), Украіна (6), Азербайджан (7) і Арменія (8). Адзіную ацэнку 12 нам паставіла Расія. Набраўшы ў суме 43 балы, Тэа з песняй «Cheesecake» размясціўся на 16-м месцы, паўтарыўшы леташні вынік Алены Ланскoй. Куды больш крыўдна, што вельмі падобная да нашага выступлення пастаноўка Даніі заняла выніковае 9-е месца.

Нагадаем, раней Беларусь толькі тройчы праходзіла ў фінал «Еўрабачання». Найлепшым дасягненнем застаецца вынік Дзмітрыя Калдуна — 6-е месца ў фінале. Ніжэй за ўсіх у свой час ацанілі выступленне Паліны Смолавай — 22-е месца ў паўфінале.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота eurovision.tv і БЕЛТА.**

■ Дзіўнае побач

# З'ЯВІЛІСЯ НА СВЕТ САСНА І БЯРОЗА...

## Абняўшыся, дрэвы растуць пры дарозе ад Алімпійскай трасы на Нясвіж

**Як вядома, зусім нядаўна Нясвіжчына славілася не толькі сваім знакамітым замкам і іншымі адметнымі збудаваннямі, але і вядомым на ўсю Еўропу ўнікальным прыродным помнікам. Я маю на ўвазе дуб і сасну. Колькі легенд складзена пра гэтую закаханую пару! Колькі турыстаў нашай краіны і замежных гасцей зачаравана спынялася перад незвычайнымі дрэвамі! А што адметнага, спытаецеся, можа мець асобны дуб альбо сасна? Гэтыя ж, што раслі пры дарозе Нясвіж — Гарадзея, здзіўлялі ўсіх: раслі яны, цесна абняўшы адно аднаго. Абняліся, сапраўды, як закаханыя хлапец з дзяўчынай. Іх шанавалі, аберагалі. У апошнія гады агарадзілі, паставілі памятна-ахоўную шыльду. Відаць, і праўда, дуб з сасной мелі вялікую каштоўнасць, бо, кажуць, падчас Вялікай Айчыннай вайны фашысты мелі намер вывезці гэтыя дрэвы ў Германію.**

Аднак усемагутны час не шкадуе не толькі людзей, але і архітэктурныя ды прыродныя помнікі. З часам састарыліся закаханыя дуб і сасна. Памерлі, пакінуўшы толькі прыемныя ўспаміны ды шкадаванне ў душах спагадлівых людзей.

Не раз паказваў гасцям Нясвіжчыны гэтыя дрэвы (а пасля месца іх жыцця) і я. Мой сум па зніклых закаханых дрэвах вярэдзіў душу. І вось сёлета да мяне прыйшла нечаканая радасць. Было гэта на Радаўніцу, калі ўсе мы, хоцькі ці няхоцькі, але, пакінуўшы свае родныя гнёзды, едзем да родных і дарагіх магіл нашых бацькоў, родных, сваякоў, аднасяльчан. Едучы ў сваю родную вёску Баяры, што на Нясвіжчыне, я міжволі скіраваў погляд на дарожную ўзбочыну. Было гэта на адрэзку асфальтавай дарогі, якая вядзе ад скрыжавання старой брэсцка-мінскай трасы (паралельна з так званай «алімпійкай») і дарогі на Гарадзею і Нясвіж.

Нечакана маё вока заўважыла тое, што прымусіла крыкнуць маёй дачцэ Надзеі, якая была за рулём: «Стой, спыніся!» Яна неўразумела зірнула на мяне, але затармазіла. Я паказаў ёй тое, што здзівіла мяне. Спачатку і сам не паверыў вачам. Але, калі падышоў да дрэў, што раслі на ўзбочыне, пераканаўся: вочы не падвялі, я не памыліўся. Сярод іншых дрэў сваёй асаблівай статнасцю (ці мо гонарам?) вылучалася адна гонкая бяроза. Не, я не маю рацыі, не адна. Бо хоць і ўзвышалася над іншымі менавіта бяроза, аднак жа расла яна не адна. Побач з ёй, практычна з самага кораня, ствол да ствала, расла крыху ніжэйшая за бярозу сасна. Ды не проста расла, прытуліўшыся сваім меднаколерным ствалом да белай бярозы, а некалькі разоў абвівала бярозу. Я адразу ўспомніў колішнія дуб з сасной і адзначыў, што тут сяброўскія повязі дрэў нават больш цесныя. Бо колькасць «абдымкаў» бярозы і сасны значна большая. Не, я не перабольшваю. Паглядзіце на здымак, і вы самі зразумееце, якімі цеснымі сумеснымі сяброўскімі повязямі назаўсёды звязаны гэтыя нясвіжскія бяроза і сасна.

Доўга стаяў я каля гэтых дрэў. Зачаравана пазіраючы на іх, згадваў іх папярэднікаў (не, бяроза з сасной растуць не на месцы колішніх дуба і сасны), разважаў і над лёсам людзей, і над загадкамі прыроды. І тут жа нарадзілася ідэя займальнай казкі пра верагодны дагэтулешні лёс сасны і бярозы. А яшчэ прыйшло ціхае суцяшэнне — справядліва ўсё-ткі зладжана ў прыродзе: памерлых заўсёды замяняюць жывыя. Так і тут: нібыта працягваючы жыццё ссохлых дуба і сасны, з'явіліся на свет сасна і бяроза. Не, спярша бяроза, калі меркаваць па таўшчыні ствала, а затым ужо каля яе вырасла сасна. На здзіўленне людзям, як сведчанне неўміручасці прыроды, доказ таго, што прыродныя цуды не знікаюць бясследна.



І таму, думаецца мне, будзе цалкам справядліва, калі і гэты нованароджаны прыродны цуд набудзе статус ахоўнага прыроднага помніка з усімі неабходнымі ўмовамі яго зберажэння, адпаведнымі патрабаваннямі да яго догляду і аховы.

Турысты ж, спадзяюся, будуць не толькі наталяць сваю цікаўнасць, аддаючы належнае цудадзейству самой прыроды, але і паважліва ставіцца да таго, што яна падаравала нам для духоўнага задавальнення і як доказ неўміручасці сваёй творчай патэнцыі.

**Анатоль БУТЭВІЧ. Фота аўтара.**

Даты | Падзеі | Людзі

**1564** год — нарадзіўся Тамаш Макоўскі, беларускі картограф, гравёр і друкар. Працаваў пры двары князёў Радзівілаў у Нясвіжы (у пачатку XVII стагоддзя кіраваў друкарняй). Выгравіраваў першую дакладную карту Вялікага Княства Літоўскага (1613 год, Амстэрдам), да якой прыкладаліся найважнейшыя звесткі па гісторыі і геаграфіі Беларусі (пералік захоўваецца ў бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта). Памёр у 1630 годзе. У Нясвіжы ўстаноўлены яго бюст.

**1905** год — у Мінску нарадзілася народная артыстка СССР Стэфанія Міхайлаўна Станюта. Яе прывыклі называць чалавекам-легендай, гісторыяй тэатра, талісманам купалаўцаў. Першую ролю артыстка выканала ў 16 гадоў у п'есе Уладзіслава Галубка «Ганка». У 1918-м яна пачала працаваць статысткай, харысткай і танцоркай у Першым таварыстве беларускай драмы і камедыі Фларыяна Ждановіча, які стаў пасля (1920 г.) Першым беларускім дзяржаўным



тэатрам. Тэатральную адукацыю атрымала ў Маскве разам з групай маладых беларускіх акцёраў, у Беларускай драматычнай студыі пры МХАТ, у класе Смышляева і Гіяцынтавай. На базе гэтага выпуску ў Віцебску ў 1926 годзе быў створаны Другі беларускі драматычны тэатр, у якім Стэфанія Міхайлаўна іграла да 1932 года. З 1932 года і да канца свайго жыцця Стэфанія Станюта прапрацавала ў тэатры імя Янкі Купалы ў Мінску. Усяго яна выканала каля 200 роляў. Яе памяць захоўвала дзіўныя падрабязнасці нашага жыцця, таго жыцця, што амаль невядомае цяперашнім пакаленням. Яна бачыла цара і памятала, як выглядаў Купалаўскі тэатр, калі ў ім праводзіліся велікасвецкія балі, ведала, як першапачаткова выглядаў фантан «Хлопчык з лебедзем»... А ў памяці сваіх калег і прыхільнікаў вялікая актрыса засталася адкрытым, добрым і спагадным чалавекам.

**1933** год — нарадзіўся Аляксандр Міхайлавіч Кішчанка, беларускі мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1980), народны мастак Беларусі (1991). Працаваў у галіне станковага і манументальнага жывапісу, ствараў роспісы, мазаікі, габелены. Сярод работ: мазаічныя пано на тарцах жылых дамоў у мікрараёне «Усход-1» і на фасадзе гасцініцы «Турыст», манументальныя габелены для будынка ААН у Нью-Ёрку і іншыя. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1980, 1996). Памёр у 1997 г.

НАРОДЖАНЫЯ 12 мая

**Яны непапраўныя свавольнікі. У іх ёсць свой стыль паводзін і прафесійныя навыкі, таму падпарадкоўвацца чужым патрабаванням не маюць намеру, часта выступаюць супраць устаноўленага парадку. Гэтыя людзі могуць успрымацца як бунтары, хаця яны часцей за ўсё кансерватыўныя ў сваім светаўспрыманні і карыстаюцца выключна логікай. У іх прысутнічае здаровая самаўпэўненасць, якая нязменна натхняе нават скептыкаў. Шчырыя ў адносінах з навакольнымі, яны падтрымліваюць свой некалькі аддалены статус і ў той жа час схіляюць іх да таго, каб ад душы пасмяяцца з жыццёвых хітраспляценняў.**

НАРОДЖАНЫЯ 13 мая

**Гэтыя людзі часта карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў грамадстве, здольныя аказваць значны ўплыў на іншых. Многія з іх з пагардай ставяцца да практычных клопатаў. Іх больш займае асабістая персона і роля, якую яны адыгрываюць у жыцці. Поспех у працы для іх спалучаецца з удасканаленнем майстэрства і павышанай упартасцю ў дасягненні мэты. Ім даводзіцца змагацца з пастаяннай спакусай адпачываць на лаўрах прыроднай адоранасці. Найбольш адукаваныя асобы знаходзяць у сабе сілы для самаўдасканалення, выбіраюць адказнасць у супрацьлегласць усёдазволенасці. Але як бы там ні было — бесклапотнасць і лёгкасць застаюцца адметнымі рысамі характару людзей, народжаных у гэты дзень.**

### ЛЯЛЬКІ НАД НЁМАНАМ

**Спектаклі не толькі для дзяцей, але і дарослых праходзяць у рамках другога міжнароднага фестывалю лялечных тэатраў «Лялькі над Нёманам» у Гродне.**

У сёлетнюю культурную сталіцу нашай краіны прыехалі артысты каля 20 тэатраў з Балгарыі, Беларусі, Літвы, Украіны, Польшчы, Расіі, Сербіі, Чэхіі і Эстоніі. Фестываль распачаўся 10 мая парадам удзельнікаў і гасцей, а з 11 па 15 мая на сцэнах тэатра лялек і драматычнага тэатра ўвазе гледачоў і міжнароднага журы будуць прадстаўлены конкурсныя спектаклі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Организация ЗАКУПИТ в больших объемах
ОХЛАЖДЕННУЮ, ЗАМОРОЖЕННУЮ СВИНИНУ
у ИП и юр.лиц по безналичному расчету
ДОРОГО.
ООО "Евроторг" УНП 101168731
8 (044) 7888 503

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 5.11 | 21.02 | 15.51 |
| Віцебск | — 4.55 | 20.58 | 16.03 |
| Магілёў | — 5.01 | 20.52 | 15.51 |
| Гомель | — 5.04 | 20.42 | 15.38 |
| Гродна | — 5.27 | 21.06 | 15.39 |
| Брэст | — 5.32 | 21.10 | 15.38 |

**Месяц**

*Поўня 14 мая.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

***Пр.** Васіля, Ігната, Максіма, Мікіты, Якава.*
***К.** Глорыі, Жанны, Магдалены, Андрэя, Германа, Роберта.*


Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

## ЗАЎТРА




### УСМІХНЕМСЯ

Дзеці — кветкі жыцця :)

Каб адвучыць маленькую дачушку лазіць у шафу, даставаць і перакладваць рэчы з месца на месца, я сказала, што там злы дзядзька сядзіць. Неяк увечары глядзім з мужам тэлевізар. Малая заходзіць у пакой і пытаецца:

— А дзядзька з шафы ўжо пайшоў?

Ледзь-ледзь растлумачыла мужу, што да чаго...

**Баба Дуся памылкова, замест бальніцы, зайшла на медкамісію ў ваенкамат і выйшла адтуль абсалютна здаровай.**

Два беларускія хакейныя балельшчыкі:

— Ты за каго будзеш хварэць на чэмпіянаце?

— За нашых, вядома!

— А потым?

**Дзяўчаты! Мужа лепш шукаць у гэтым годзе! Таму што 2015-ы будзе годам Казла!**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.836. Індэкс 63850. Зак. № 1999.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 12 мая 2014 года.